**Станіслаў Суднік**

# Мой Грунвальд

Ліда 1999 г.

## Слова пра кнігу

Кніга " Мой Грунвальд" пісалася доўга. У яе ўвайшлі вершы розных гадоў, але ў асноўным гэта вершы Казахстанскага перыяду і вершы апошняга часу. Пад кожным вершам стаіць дата напісання. Гэта зроблена не для нейкай важкасці ці яшчэ чаго.

Вершы пісаліся ў эпоху рэзкіх пераменаў у грамадстве. Разам мянялася і свядомасць народа і свядомасць кожнага чалавека, мяняўся ўзровеь ведаў пра Беларусь. Пэўныя падзеі выклікалі пэўныя асацыяцыі, і ўзнікалі вершы. Пазіцыі многіх вершаў можна сёння аспрэчыць, але тады, пад час тых падзей яны здаваліся бездакорнымі. Усе мы жывыя людзі і ўсе мы маем права на нейкую памылку. Ідэі, закладзеныя ў вершы, на нечую думку будуць не ўспрымальнымі, а на нечую - абсалютна беззаганнымі. І ў гэтым няма нічога страшнага. Жыццё дыктавала гэтыя вершы. Нажаль, вершы не маглі дыктаваць жыцця, а мусілі толькі адлюстроўваць.

Вершы згрупаваны ў цыклы. Магчыма лепш было б даць іх у храналагічнай паслядоўнасці, але хацелася і пра мову, і пра Нясвіж, і пра выбітных людзей, і пра ўсё іншае сказаць на адпаведным фоне і ў адпаведнай чарговасці.

Я выказваю шчырую падзяку Валерыю Сліўкіну за падтрымку гэтага выдання, а таксама ўсім тым, чые імёны назваць яшчэ рана, але, без каго, кніга б не выйшла.

Вось і ўсё пасляслоўе. Час ідзе далей. Напішацца нешта новае. А ўсё выкладзенае ў гэтай кнізе мусіць застацца ў мінулым, каб жыць сваім самастойным жыццём.

Хай лепей ніколі не будзе краіны,
Чым будзе краіна без волі.

*Джахар Дудаеў*

## Пагоня за мову

* * *

Ці не падумалі, панове,
Я змоўк, не глянуўшы на свет,
Што не скажу на роднай мове
Я больш ні слова, як паэт,

Што стэп, тайга, гады, дарогі
Зламалі дух і голас мой,
Што дзесьці ўпаў я ад знямогі,
Ці мо купіў сабе спакой

Цаной адмовы ад змагання,
Цаной маўчання ў шмат гадоў,
Што цяжкі камень раставання
Прыдушыць памяць і любоў,

Што абыякавасць атрутай
Агорне сэрца і душу,
Што боль за родны край пакутны
Ў сабе адчаем за душу?..

Дык вы змыліліся, панове,
Маўчаць мяне не змусіць вам
Бо век не здраджу роднай мове
І вам за здраду "аз ваздам".

24.03.76 г.
15.05.88 г.

### ПАГОНЯ ЗА МОВУ

Над зямлёй імчацца коні,
Капытамі лісце рвуць,
Грозных рыцараў Пагоні
На сабе яны нясуць.

Гарады мінаюць, вёскі,
Узрываюць сонны дол
Пра Пагоню пагалоскі
Разлятаюцца вакол,

Будзяць воінаў у хатах
Спаць палацам не даюць,
І хто ў світках, а хто ў латах
Беларусы паўстаюць...

Зноў грыміць, ляціць Пагоня,
Да Пагоні той прыстаць
Клічу, клічу я сягоння:
Хопіць, хлопцы, хопіць спаць!

Ці не бачыце, што мову
Затапталі нашу ў гной,
Дзецям нашым нашых словаў
Ажно сорамна парой.

Беларускай роднай мовы
Ўжо не ведаюць яны
І з акцэнтам мадэрновым
Кажуць імя Скарыны.

Гіне мова, прападае,
На ратунак кліча нас.
Я Пагоню аб'яўляю:
За яе! У сёдлы! Час!
15.05.88 г.

## СУД

Гэй, устаньце, беларусы,
На суд мацеры-зямлі,
Адкажыце, беларусы,
Вы за колькі прадалі

Мову нашу, мову маці,

Мову пушчаў і бароў,
Мову Койданаўскай раці
І Грунвальдскіх ваяроў?

Мову Коласа, Купалы
Вы за колькі прадалі?
Трыццаць срэбнікаў, не мала,
За радзімую ўзялі?

Вы ўзялі якой манетай:
Фунтам, франкам ці рублём?
Можа вы яшчэ пры гэтым
Іншым хапнулі дабром?

Можа вы ўзялі чынамі,
Дабрабытам гарадскім,
Дарагімі лахманамі...
Ці ж хапіла хоць усім?

Можа ў прыпражку вы з мовай
І сумленне прадалі,
За яго мараллю новай
Ці культурай узялі?

Ды хутчэй жа іх хавайце:
Маркі, долары, рублі,
Рукі з мылам адмывайце,
Трыце, чысціце ў зямлі.

Мо яна, зямля паможа
Срэбны пыл саскрэбці з вас,
Ды схаваць усіх не зможа
Ад расплаты. Прыдзе час,

Вас спытаюць вашы дзеці,
Што пакінулі вы ім,
А ў адказ вы зазванеце
Срэбрам Юдавым сваім,

Раскажыце слова ў слова,
Як зракліся той зямлі,

Як сваю культуру, мову,
Як свой гонар прадалі.
26.05.88 г.

## ПРАМОВА ДА МОВЫ

Ты мовай Рагнеды была і Ўсяслава
І мовай Ягайлы таксама была,
Гучала ў паходах і бітвах крывавых,
У мудрых статутах і песнях жыла.

Табой размаўляў цар Міхайла Раманаў,
Ігнат Грынявіцкі табой размаўляў,
Ты чулася разам са звонам кайданаў
З табою народ за свабоду ўставаў.

Была ўсенароднай, высокай, дзяржаўнай,
А стала чужою ў радзімым краі,
А стала сваячкаю беднай, бяспраўнай
Няпрошанай госцію ў багатай сям'і.

Цябе праганяюць са школы і хаты
І выперлі моўчкі з усіх устаноў,
І з інстытутаў, музеяў заўзята,
Нахабна цябе выганяюць далоў.

Стараюцца смехам, пагардай, прымусам
Цябе, нашу мову, забіць і забыць...
Хто ж нішчыць цябе?
Ды, свае ж, беларусы,
І гэта цяжэй, чым прыгнёт перажыць.
31.05.88 г.

## БЫЛОЕ

Табой размаўлялі
Цары і баяры,
Цябе пераймалі
Літва і татары.

Табою складалі
Статуты, паданні,
Табой друкавалі
Святое пісанне.

Цябе прадавалі
Паны і паненкі,
Цябе шанавалі
Мястэчкі, засценкі.

З табой паміралі
На вісельнях царскіх,
Цябе пазнавалі
Па словах бунтарскіх.

Была ты з народам
У бітвах за волю,
З байцом у паходах,
З аратым у полі.

Ад нечысці ўсякай
У пушчы ўцякала,
Няходжаным шляхам
Гадамі блукала.

Хавалася ў лёхах,
У нетрах балотных,
Баялася крокам
Прайсціся свабодным.

Цябе шкадавалі
Пяшчотна любілі,
Цябе катавалі,
Калечылі, білі.

Цябе забывалі,
Цябе ўспаміналі,
Цябе вывучалі,
Цябе адмянялі.

Душу саграваала

Ты ў зімнюю сцюжу,
Любоў аздабляла
Валожкай і ружай.

Была ты патрэбнай,
Была неабходнай,
Нікому не дрэннай,
На ўсе была годнай.

Была ты часцінай
Краіны радзімай,
Была ты адзінай,
Была ты любімай.

6.06.88 г.

**НА КРЫЖЫ**

На зямлю тую Хрыстус не сходзіў,
А ў балотах чорт неяк тануў,
Тут спрадвеку, ці жыта не ўродзіць,
Ці па хаце пярун смалянуў.

На зямлі той бязвольныя людзі
Калупаюцца моўчкі ў грахах,
Цвіллю дыхаюць хілыя грудзі,
Душы віснуць на мшалых крыжах.

Там няма ні спакою, ні веры,
Там няма ні мяжы і ні меры,
Там крумкач усім песню спявае,
Распаўзаецца гаць гадаўя,
Штохвіліну жыўцом там канае
Беларуская мова мая.

25.09.90 г.

**МАЯ МОВА**

Гой ты, мова мая шарачковая,
Беларуская мова мая,
Ты для нас не старая,не новая,

Ты ад веку свая і свая.

Ты не панская, ты не высокая,
Бо ты ж "простай" заўсёды была,
Як радзіма твая сінявокая,
Ты між простым народам жыла.

Злы маскаль, бальшавік, сіла клятая
Насміхаліся ў вочы з цябе,
На крыжы паняверкі распятая
Памірала ты ў чорнай журбе.

Ксёндз цябе не праславіў з амбона ,
А поп ў цэркве цябе не вітаў,
Сакратар бальшавіцкіх райкомаў
У сібірскіх снягах пахаваў.

На табе ўжо не шэпчуць каханыя,
Без цябе зачынаюць жыццё,
Толькі мы ўсё яшчэ непрыкаена
Прадаўжаем зямное быццё.

Толькі мы, богам, чортам забытыя,
Нават дзеці зракаюцца нас,
Лезем, лезем у бойкі адкрытыя,
А супроць і прырода, і час.

Толькі мы, як фанатыкі п'яныя,
Не адходзім яшчэ ні на крок,
Мы навечна, табе мы адданыя,
На нас страшны, нязломны зарок.

Мы паляжам касцьмі спарахнелымі,
Ды, усё ж, не зрачомся цябе,
Мы пакінем Зямлю нашу Белую,
Ці ў свабодзе, ці ў вечнай жальбе.

18.09.90 г.

## ДЗЕЦІ СІНЯВОКАЙ БЕЛАРУСІ

I
Дзеці сінявокай Беларусі,
Колькі вас раскідана па свеце,
Колькі вас, двӱно забытых, мусіць
На сабе гайдаць міжзорны вецер,

Колькі целаў цяжар непад'ёмны
Прыкаваў да земляў невядомых,
Колькі душ паміж сусветаў цёмных
Не знайходзяць сцежачкі дадому,

Колькі вас касмічнымі шляхамі
Моўчкі непрыкаена блукае
І таго, што згублена не вамі
Безнадзейна роспачна шукае?

Хто шукае згубленую волю,
А хто гонар дзедавай суліцы,
Хто шукае страчаную долю,
А хто водар чэрвеньскай суніцы.

Хто імкліва шчасце даганяе,
Хто нядолю за вярсту абходзіць,
Кожны найгалоўнае шукае,
Ды ніхто чамусці не знайходзіць.

II
Дзеці сінявокай Беларусі,
Вам не зведаць радасці знаходкі,
Вам і зоркі на нябёсах схлусяць,
Вам да ног прывязаны калодкі.

Затрасе вас лёсу ліхаманка,
Пыл няўдач засыпле вашы вочы,
Не засвеціць раніца заранкай,
Не заззяе месячык уночы.
III
Дзеці сінявокае краіны,
Хто аджыў і будучыні людзі,

Вы ж згубілі вашую Айчыну,
А другой у вас ужо не будзе.

Вы згубілі матчыну спагаду
І цяпло бацькоўскае хацінкі,
Пах духмяны восеньскага саду,
Шэпт зялёны муражной травінкі.

Вы згубілі звон вады крынічнай
І не злосны гром нябёс вясновых,
Над старой буслянкай клёкат зычны...
Вы згубілі гэта разам з мовай.

Вы згубілі дзедавую казку,
Вы згубілі матчыную песню,
Строгі погляд са старых абразоў
Ні дабром, ні верай не ўваскрэсне.

К вам дзяды не прыйдуць на вячэру,
Вы чужыя сотням пакаленняў,
Вы на грошы прамянялі веру
За пакору спляжылі сумленне.

Прашчуры адвернуцца сярдзіта,
Вашых душаў гнеўна не пазнаюць.

IV

Дзесь між зорак па шляхах разбітых
Здані беларускія блукаюць.

15.11.90 г.

**НА КЛЕЦКІХ МОГІЛКАХ**

Светлай памяці настаўніцы беларускай мовы
Казлоўскай сярэдняй школы Нясвіжскага
раёна Майсені Леаніды Аляксандраўны.

Па могілках ціхіх аднойчы
Я сцежкай самотнай ішоў,

Слізгалі задумліва вочы
Па даўніх карунках крыжоў.

Вісеў у паветры маўкліва
Пыл слаўных і змрочных падзей
І асядаў клапатліва
На скончаных лёсах людзей.

На прыкладах, стэлах, каменнях
Чыталася ўсюды адно -
За жыццямі ўсіх пакаленняў
Народа жыцця не відно.

З расейскімі словамі пліты,
І з польскімі тут жа стаяць,
Ды толькі на роднай, забітай,
Ды толькі на ёй не відаць.

Чаму? Вам сказаць не бяруся,
Ды немы адчуў я дакор:
Гнуў спіну бядак беларусам,
Аж бачыш! Палякам памёр.

І толькі ў кутку пад рабінай
Я ўбачыў, што гэтак жадаў,
Я надпіс на мове радзімай,
На мове сваёй прачытаў.

Праглядваю тэкст паўсвядома -
Між смерцю і вечнасцю гаць,
А ён чымсьці дзіўна знаёмым
Бег думак спрабуе суняць.

Спаволены крок прыпыняю,
Душэўшы забыты спакой.
З пад літараў ціха ўсплывае
Настаўніцы вобраз маёй.

*

Згарэлі, як зыркія дровы,
Гады і спыліліся ў час,

Настаўніца роднае мовы
Калісьці так дбала пра нас.

Яна нас вучыла сусвету
Радзімых і песень, і слоў,
Яна з нас рабіла паэтаў,
Яна ў нас уклала любоў.

Яна нам расказвала казкі
На мове радзімай зямлі,
На іх, як на тыя абразкі,
Мы чуць не маліцца маглі.

Яна нас вучыла нахненню
І веры ў гаротны наш край,
Яна нас вучыла імкненню
Ў жыццё, як у песенны грай...

*
І вось я прыціх у самоце
Гляджу на магілу яе,
Ды нешта ў святой адзіноце
Спакою душы не дае.

Здаецца, сакрэт ці загадка
Хаваецца ў гэтай журбе,
А розум маўчыць, і адгадка
Стамлёнае сэрца дзяўбе.

І раптам мяне асвятліла,
Яна ж.., зразумей і павер,
Не толькі тады нас вучыла,
А вучыць нас, нават, цяпер.

Яна з небыцця, з часастою
Працягвае працу сваю,
Яна і магільнай плітою
Выкладвае мову маю.

21.03.92 г.

* * *

Дзіцятка малое
Любою парою,
Калі не спрабуеш спытаці,
Як зможа, то скажа,
А не, дык пакажа
Між соцень жанчын сваю маці.

Мы ж край свой радзімы,
Спрадвеку адзіны
Чамусьці ніяк не прызнаем
І мовай чужынскай
З ляноты злачынскай
Штодзённа яго абражаем.

Мы часу не маем,
А мо не жадаем
Нарэшце -урэшт зразумеці,
Што робяць балюча
І крыўдна пякуча
Зямельцы сваёй яе дзеці.

З чужыніцы клятай,
З трасянкі праклятай
Сцячэ ўся краіна слязамі,
Дзе мова чужая,
Там рэчка нямая,
Лес вые аднымі ваўкамі.

Там кветкі маўкліва,
Шпакі палахліва
Над мёртвай зямлёю гібеюць,
А нас навучыці,
Душу абудзіці
Малыя, нямыя не ўмеюць.

Дык што ж, так і будзе?
Дык што ж, мы не людзі?
Ці ж час не настаў памянящца
І мовай сваёю

З радзімай зямлёю
У песні адзінай з'яднацца?
9.02.93 г.

* * *

Я гляджу ў далячынь заімглённую
Цераз шэрань асенняга дня,
Пешчу ў сэрцы я думку стаённую,
Што мы дойдзем усё ж да відна.

Што праз зімы і сцюжы з марозамі,
Хоць паўзком дапаўзём да святой,
Да краіны, дзе клёны з бярозамі
Шэпчуць казкі на мове маёй,

Дзе ўсе дзеткі звычайнымі словамі
Звоняць з рання ажно да цямна,
І ніякай чужынскаю моваю
Страшыць нас нават сэнсу няма,

Дзе мы сталі вялікаю нацыяй,
І валодаем роднай зямлёй,
І з бязгрэшнасцю цноты дзіцячае
Ганарымся Радзімай сваёй.
18.12.93 г.

***

Покуль я быў беларусам,
Землю сваю я любіў
Вольнаю воляй, без нечых прымусаў
Ўсё, што патрэбна, рабіў.
Покуль я быў беларусам.

Покуль я быў чалавекам,
Мову сваю шанаваў
Слоўца ніколі на здзек я
Злыдню павек не аддаў.
Покуль я быў чалавекам.
6.02.95 г.

## ВЯРТАЕЦЦА МОВА

Вяртаецца мова...

З далёкай чужыны,
З выгнання ліхога
Да роднай Айчыны,
Да продкаў парога

Вяртаецца мова!

Вяртаецца мова...

То ружай чырвонай,
То белым рамонкам,
То словам натхнёным,
То песняю звонкай.

Вяртаецца мова!

Гавораць на мове...

Лясы і дубравы,
Азёры і рэчкі,
Высокія травы
І птушак гняздзечкі

Гавораць на мове!

Гавораць на мове...

Хлапцы і дзяўчаты,
Бабулі сівыя,
Матулі і таты,
І дзеткі малыя
Гавораць на мове!

15.03.93 г.

## УРОК ПРА ПАРОКАЎ

1
Было спачатку слова,
А потым стала кніга,
Між імі быў прарок.
З такое вось прадмовы
Памалу і паціху
Пачнём мы свой урок.

Было спачатку слова,
Што Бог паслаў прыродзе,
І вуснамі Хрыста
На ўсіх сусветных мовах
Вучыў нас і даводзіў,
Што Бог ёсць дабрата.

А после на паперы
Застылі словы Бога,
Як мудрасці крышталь.
З іх прарастала вера,
Да людскасці дарога
І будучыні даль.

Хрыстос застаўся дзесьці
Між словамі і кнігай,
Як вечны дух нябёс.
А кнігі - Бога дзеці
Праз холад і адлігі
Народ з сабой панёс.

2
Па-над Нёмнам і Дзвіною
Ў ладзе з роднаю зямлёю
Жыў магутны мой народ.
Поле ён умеў араці,
Злыдня, таця ваяваці
Запар кожны божы год.

Сонцу верна пакланяўся,
У агня пра лёс пытаўся,

Як спрадвеку вечны век,
Ды душою не стамляўся,
Вечна некуды ўсё пяўся
Цар прыроды - чалавек.

І спаткаў аднойчы Бога.
Гразкай, збітаю дарогай
Слова ў гэты край прыйшло,
І за праўдаю святою
Над бяспамяцтва смугою
Сонца новае ўзышло.

З-пад нябескавае сіні
Ў свет зрабіла Ефрасіння
Свой святы ахвярны крок,
Кнігай край свой надарыла
І сабой грахі скупіла -
Першы той зямлі прарок.

3
Расквітнеў мой край прыгожа
І багаццем, і красою,
І чысцюткаю душою,
Разагнаў цароў варожых
І, як моцнаму належыць,
Распрастаў, бы плечы, межы.

Слаўны край у наваколлі
І тавáрамі сваімі,
І хлапцамі маладымі,
Ды імкнецца далей, болей.
Ён ужо святыя словы
Хоча мовіць роднай мовай.

Нараўне стаяць ён хоча
І з краінамі старымі,
І з пасадамі святымі.
І вось тут, дзе дуб шапоча,
Ў надпалотанецкай цішы
Ўжо расце малы Францішак

І з сваім узросшы словам
Кнігу ў ім ён даў народу
І духоўную свабоду,
Да святых узняў ён мову,
І наўслед за гэтым крокам
Стаў у нас другім прарокам.

4
Шчасце-доля панавала
Ўсцяж па ўсёй краіне,
Ды спакою не давала
Зайздраснай чужыне,
Накацілася навала,
Край радзімы гіне.

Раці смелыя на полі
Леглі пад сцягамі,
Дзеці іх з чужынскай волі
Сталі чужакамі,
А люд просты ў нядолі
Звоніць ланцугамі.

Сталі цяглавай жывёлай
Дзеці курных вёскаў,
Ні царквы сваёй, ні школы,
Росцяць неданоскаў...
Ды тут з пушчаў на раздолле
Выйшаў Каліноўскі.

Слова зноўку загучала
Над усёй зямлёю
Кніга следам падступала
Бурнаю ракою,
А прарока ўжо чакала
Маскаўня з пятлёю.
5
Кастуся маскаль павесіў
І душу ў людзей забіў,
Памяць здрадай атруціў,
Каб ніколі не ўваскрэслі,
А каб вечна крыж свой неслі

Здані ціхія наўздзіў.

Без гісторыі і мовы
Нехлямяжы беларус,
Шкуру ўсе з яго дзяруць.
Ён не скажа супраць слова,
Ён сцярпець ўсё гатовы,
Не шкада яго нічуць.

Ён маўчыць, ды крыўды слова
З неба зноў яму зышло,..
Памяць болем апякло,
Нарадзілася нанова
І з ударам Перуновым
Ў сэрцы гневам прарасло.

І народ сябе спасцігнуў
І зрабіўся цвёрды крок...
Тут я скончу свой урок,
Бо чутна між сцюж адліга,
Бо цякуць паводкай кнігі,
Значыць, ходзіць дзесь прарок.

30.10.94 г.

# Усяславічы

*У 1129 годзе сын Уладзіміра Манамаха Мсціслаў захапіў у палон і прадаў у Візантыю сыноў і ўнукаў Усяслава Полацкага: Расціслава, Давыда, Святаслава, Глеба Рагвалодавіча, і Давыда Рагвалодавіча. Аднак там яны сталі выдатнымі палкаводцамі, начале візантыйскіх легіёнаў паспяхова ваявалі ў Анатоліі. У 1140 годзе Святаслаў і Рагвалодавічы вярнуліся ў Полацк, стварылі войска накшталт візантыйскага. Ад гэтага моманту Полацкая зямля канчаткова выйшла са складу Кіеўскай Русі.*

З гістарычнай спадчыны.

Зорны час легіёнаў. Жалезны іх крок
Аддаецца, як жах, па абшарах,
Чорнай сажаю пыл анатольскіх дарог
Асядае на грэчаскіх тварах.

Зноў яны паднялі на чырвоных шчытах
Гонар, славу і лёс Візантыі,
Зноў заззялі на вострых кароткіх мячах
Для імперыі дні залатыя.

А вядуць легіёны па дзікіх гарах
Пяць страцігаў з далёкай краіны,
Што хаваецца недзе ў лясах і снягах,
Дзе канчаецца клін жураўліны.

Пяць страцігаў з зямлі, дзе з крыніцы журбы
Льецца кроў векавой непакоры,
Пяць, што ўчора - князі, а вось сёння - рабы,
Адначасна і ў славе, і ў горы.

Кіеўляне ўзялі іх у жорсткім баі
І саслалі на смерць і на муку,
Ды "маліліся людзі ў радзімым краі",
І Ўсявышні малітвы паслухаў.

Рабства цяжкім ярмом не знявечыла іх,
Не распяла душу іх і волю,
Мужна волю мячамі дасталі ў баі,
Грозна дзідамі здолелі долю.

*

Будзе пройдзен паход не адзін і не раз,
Іх карзном не раз слава пакрые,
Будзе мноства баёў і настане той час,
Як ім Полацк вароты адкрые.

У святую Сафію зайходзяць яны,
І мячы на алтар палажылі,
І пазвалі народ да святое вайны,
І Пагоню ў краі аб'явілі.

І за імя Рагнеды паўстала Зямля,
І за славу Ўсяслава паўстала,
І з душы с камянелай кайданы зняла,
І схаванаю сілай зайграла.

*

Зноў ідуць легёны. Жалезны іх крок
Аддаецца, як гімн, па абшарах,
Белай пудраю пыл палачанскіх дарог
Асядае на крывіцкіх тварах.

Зноў ідуць легёны і вораг бяжыць,
І паўсюль новы дзень наступае,
Ззаду іх старажытны іх Полацк ляжыць,
Ну а спераду іх Беларусь сустракае.

ліпень-верасень 1988 г.

*Вести же разшедшися по всем градом о мудрости ея и о блазем учении ея, ио телесной твари ея, бяше бо лепа лицом... ... И ту въшедши нача подвиж-нейши подвиг постническы воспринимати. И нача книгы писати своими руками. И наем емлеюще требующим даяше...*

(Жыццё Ефрасінні Полацкай)

Свечкі агарак на грубым стале,
Келля спрадвеку сырая,
Зданні хаваюцца ў шэрай імгле,
Кніжку чарніца чытае.

Словаў заморскіх разбылтвае вязь,
Думкаю іх аздабляе,
Мудрасць і веліч, і нізасць, і гразь
Светлай душой спасцігае.

Новую кнігу на мове сваёй
Піша і піша чарніца.
Кожнае слова ўжо з новай душой
Мусіць вось тут нарадзіцца.

Піша чарніца і думка яе
Цэлы Сусвет абдымае.
Межаў, запораў даўно не стае
Цемра тых дум не стрымае.

*

Ружай чароўнай княжна Прадыслава
Ў Полацку слаўным квітнела,
Вартым унучкі самога Ўсяслава
Розумам светлым звінела.

Сватаўся князь не адзін да яе,
П'яны вачэй яе сінню,
Ніва ж другая на роллі свае
Клікала ўжо Ефрасінню.

Ніва другая, дзе словам аруць,
Сеюць дабром дзе і верай,
Веды, як кветкі, дзе вечна цвітуць
Думкай узрошчаны смелай.

*

Піша чарніца, а людзі ідуць
Словам святым прычасціцца,
Дух узмацніць і душу адамкнуць,
Праўдаў адвечных напіцца.

Піша, гаворыць і вучыць людзей,.
Леты мінаюць і зімы,
Камень за каменем мужна кладзе
Ў сцену будынка Радзімы.

Камень за каменем моцна кладзе,
Каб недавяркі і таці
Мову, культуру не ўкралі ў дзяцей,
Не прадалі разам з маці.

89 г.

*Адзін Ізяслаў толькі*
*сын Васількoвы*
*Сам пазваліў мячамі сваімі*
*Аб шлемаў літоўскіх стальныя аковы*
*Ускалыхнуўшы днямі былымі.*

(Слова пра паход Ігаравы)

Б'юць званы святой Сафіі,
Грозна, гулка, страшна б'юць,
Гукі вытамі цяжкімі
На кавалкі сэрца рвуць.

Б'юць званы святой Сафіі,
А ў набаце тым чуваць,
Як дружын мячы стальныя
Аб шаломы дзесь звіняць.

Гэта храбры сын Васількаў
За рубеж пераляцеў,
Ён з літвою ратнай сілай
Сам памерацца схацеў.

Ён хацеў высокай славы,
Ён літву хацеў спыніць,
Славу прадзела Ўсяслава
Ратным подзвігам зацміць.

Ён прыйшоў адзін у поле,

Ён братоў не стаў чакаць,
Сам сабе адмераў долю,
Сам застаўся там ляжаць.

Пад мячом цяжкім, узлётным
Долу ўпаў князь Ізяслаў,
Аб тым вычыне журботным
Звон Сафійскі застагнаў,

Застагнаў, загуў сярдзіта,
Кожны выт праклёны шле
Тым, хто славаю пакрыты,
Тым, хто сілаю наліты,
А сягоння не ў сядле,

Хто сягоння корд сталёвы,
За Радзіму не падняў,
Хто на тлусты кус і мову,
І Айчыну прамяняў.

*
Б'юць званы святой Сафіі,
Год за годам б'юць і б'юць,
І пад звон той маладыя
Усяславічы растуць

22.11.88 г.

**МАКСІМУ КРЫВАНОСУ...**

*Бліжэйшы паплечнік Багдана Хмяльніцкага, палкоўнік яго войска - самая гераічная і загадкавая асоба, Максім Крыванос быў з лесаўчыкоў (лісоўчыкаў), удзельнічаў у паходах на Маскву, у трыццацігадовай вайне пад началам прынца Кондэ. Рэмбрандт намаляваў з яго славуты партрэт "Чалавек са шрамам".*

Вяльможны палкоўнік казацкае славы,
Самога Багдама жывы пабрацім,
Згубілі гісторыкі шлях твой яскравы,
Твой корань згубілі між курных хацін.
Вяльможны палкоўнік, на памяць не жалься,

Ў табе не сканае павек лесаўчык,
За многіх ты біўся, за многіх змагаўся,
Хавацца ад кулі даўно ты адвык.

Славуты палкоўнік казацкае волі,
З-пад пэндзля Рэмбрандта глядзіш, як жывы,
Не ўведаць нашчадкам ніколі, ніколі
Няўтольнага болю тваe галавы.

Не ўведаць нашчадкам імкненняў высокіх
І думак палёту да родных сяліб,
Што вынянчыў ты паміж стэпаў шырокіх,
Што ў бітвы няўхільна, рашуча вялі.

А думаў ты проста пра пушчы і рэкі,
Мацней што за сэрца, чым песні бяруць,
Пра бацькі хаціну, што страціў навекі,
А думаў Максім пра сваю Беларусь.

## ...І ЛЕСАЎЧЫКАМ

*Лесаўчыкі (лісоўчыкі) - Беларуская лясная вайсковая вольніца, сабраная панам Лісоўскім і кінутая ў пекла войнаў з Масковіяй. Пасля вайны лесаўчыкі ў якасці наёмнікаў удзельнічалі ў трыццаціігадавай вайне пад началам прынца Кондэ. Мала хто вярнуўся, а хто вярнуўся, прыстаў да войска Багдана Хмяльніцкага.*

Лесаўчык - гэта слова пранізана жахам,
Лесаўчык - гэта воля, і спрыт, і вайна,
Лесаўчык - гэта слава, і пуга, і плаха,
Лесаўчык - гэта праўда і гэта мана.

Пан Лісоўскі, калісці сабраўшы атрады,
Сам не зведаў дашчэнту, што ён спарадзіў,
Мелі спрыт, мелі ўдачу, не мелі спагады,
Непакора і смеласць спляліся на ўздзіў.
Іх адпелі даўно на зямлі сінявокай,
А яны ў шыхце цесным ізноў у баі,
А яны пад Масквой на чужбіне далёкай,
А яны, як ніколі, жадаюць крыві.

Біцца ўмеюць яны, толькі польская здрада
Б'е мацней, чым маскоўскі затуплены меч,
І ўжо зараз для іх невымольна спагада,
І вось-вось галава адцураецца плеч.

Ды, хто волі аднойчы напіўся з крыніцы,
Не надзене ніколі пакоры ярмо,
І па Францыі грознае войска імчыцца,
І на Францыю жахі наводзіць яно.

*

Беларускі наёмнік, жаўнер, валацуга,
Што забыўся ты ў гэтых далёкіх краях,
Дзе, калі ты і кім адарваны ад плуга,
І як стала чужой табе маці твая?

Беларускі наёмнік, табе толькі ўперад,
Б'е аб грудзі твае ўсіх краінаў свінец,
А ты ўбіўся ў крывавы, бязлітасны нерат,
І цябе знойдзе тут твой заўчасны канец.

Вы паляглі ў далёкіх, бясконцых краінах,
Рэдка хто ўбачыў пушчы, азёры свае,
Патанулі ў гадах, нат, пра вас успаміны,
Балазе хоць Максім з небыцця паўстае.

Вяляможны палкоўнік, ты не здолеў да скону
Хоць хвілінку пабыць на радзімай зямлі,
Ты на братняй Украйны паўстаў абарону,
Ва Ўкраіны зямлю твае косці ляглі.

А чым лепшыя мы, хто па службе сягоння,
Што мы робім, каб ты, Беларусь, расцвіла.
Кожны з нас для цябе той далёкі наёмнік,
Ты без нас пражывеш, як дагэтуль жыла.

13.01.91 г.

## ВОРША

*У 1514 годзе, 8 верасня 30-тысячнае беларускае войска,пад кіраўніцтвам гетмана Кастуся Астрожскага ўшчэнт разбіла 80-тысячную маскоўскую арду над рэчнай Крапіўнай каля Воршы.*

Сёння зноўку заломы ў часе,
Сёння зноўку на здрадніцкай пласе
Край радзімы, мая Беларусь.
Сёння зноўку нас шчасце абходзіць,
Сёння зноў тут маскаль верхаводзіць,
Сёння зноў мой народ прадаюць.

Сёння зноў, мой народзе,ты горшы,
Ды была ж, ды была ж у нас Ворша,
Мы павінны той дзень памятаць.
Мы тады над Крапіўнай стаялі,
Па-над намі анёлы ляталі,
Мы гатовы былі паміраць.

Ды былі мы пад ласкаю Боскай,
Вёў на бітву нас гетман Астрожскі,
Ну а ён то ж умеў ваяваць.
Адбівалі мы страшныя ўдары,
Растрасалі варожыя хмары,
Не адолеў нас вораг зламаць.

А як гетман руку з булавою
Ўзняў высока над хцівай ардою,
Нас не змог ужо вораг стрымаць.
Білі, секлі мы лютую зграю,
Выганялі з радзімага краю,
Той пагоні было не суняць.

Сёння зноў мы стаім пад сцягамі,
Сёння зноўку арда перад намі,
Хцівы вораг рабуе наш край,
Сёння мусім гатовымі быці
Зноў у лютую сечу ўступіці,
Выгнаць з сэрца тугу і адчай.

Дык уздымем галовы высока,
Дык расправім жа плечы шырока
І гукнём у бясконцую даль
Для спакою жывых і памёршлых:
"Будзе, будзе ізноў у нас Ворша,
Будзе біты ізноўку маскаль".

6.09.94 г.

## ПЕРАД ПОМНІКАМ СКАРЫНЕ Ў ЛІДЗЕ

Ты доўга блукаў па стагоддзях і свеце,
Пакуль не спыніўся на Лідскай зямлі,
Дзе кнігі Твае, наймілейшыя дзеці,
У душах удзячных прызнанне знайшлі.
Ты доўга хадзіў за мяжой і за часам,
Апостал і геній народа свайго,
І з думкай сваёй заставаўся сам на-сам
Не могшы дабіцца да сэрца яго.
Пяць соцен гадоў ты ўжо ведаў пра тое,
Пра што мы сягоння талкуем ізноў,
Ты, быўшы народжаным гэтай зямлёю,
Быў сынам тутэйшых і песень, і слоў.
Ты слова паставіў паперадзе думкі,
Бо ведаў, што Слова спачатку было,
Ты праўды адвечныя ў словаў карункі
Аздобіў і Слова па свеце пайшло.
Бо што значыць думка ў халоднай латыні,
Ці ў грэцкай там мове, ці ў іншай якой?
Ды гэта, як фінік, у нашай краіне,
Ўзысці не паспее, як змерзне зімой.
Тут трэба кідаць тое зернейка ў глебу,
Што выстаіць год аж да жніва свайго,
І Ты для народа духоўнага хлеба
Прынёс той акрайчык на мове яго.
І быў Твой народ і багатым і слаўным,
Вялікім і мудрым народ гэты быў
Датуль, аж пакуль ён увішна і спраўна
Адзіную мову сваю бараніў.
А мову пакінуў, дык мудрасць разводдзем
Сцякла паплавамі ў чужыя краі,

І кожны брахлівы хапуга і злодзей
Зноў дурыць, як можа, нашчадкаў Тваіх.
Стаіш Ты у Лідзе, і дзякаваць Богу,
А міма штодзень сотні, тысячы йдуць,
Яны ад Цябе, як ад бацькі парога,
Дрыготкую памяць пра вечнасць нясуць.
У вочы Твае заглядаюцца людзі,
І кожны, хто зможа Твой погляд адчуць,
Тут жа згадае, што ён - не прыблуда,
Што ён - беларус і што тут-Беларусь.

24.08.98 г.

## ОДА БЕЛАРУСІ
### на дзень злучэння з Расеяй, або апошняя песня Якуба Ясінскага

*Якуб Ясінскі - кіраўнік паўстання 1793 года на Беларусі і Літве. Загінуў пры абароне Варшавы ад войскаў Суворава. Пісаў вершы і песні на беларускай мове.*

Беларусь!
У тым няма твае віны,
Што палеглі заўчасна ў дол
Твае найлепшыя сыны,
І здрада навакол.

У тым няма твае віны,
Што правіць баль крумкач
І што прыходзіць дзецям у сны
Адно матулін плач.

У тым няма твае віны,
Што люд твой у журбе,
І прывід новае вайны
Блукае па табе.

У тым няма твае віны,
Што прадаюць цябе...
Мы ў гэтым вінаваты, мы
І мы клянём сябе:

"Няхай не здолее рука
Кавалка хлеба ўзяць,
Калі не здолела яна
Штандар святы падняць.

Няхай не змогуць пальцы больш
Крануць струмень вады,
Калі не здолелі курок
Націснуць ў час бяды.

Няхай не носяць ногі нас
Па добрай той зямлі,
Калі яны ў паўстання час
Ў атаку не пайшлі.

Няхай не бачаць вочы дня,
Калі змаглі глядзець,
Як злыдняў сквапная гайня
Радзімы край грызе..."

Беларусь!
У тым няма твае віны,
Што зноў ты на крыжы,
А вінаваты кожны, хто
Пад крыжам не ляжыць.

14.06.94 г.

## НА СМЕРЦЬ ЛЮДВІКА НАРБУТА

Над Лідай пад вечар закрумкаў крумкач,
І сонца ў крывавым змярканні зайшло,
Усхліпнуў Лідзейкі галосіна-плач,
Жыццё чалавека ў прадонне сышло.

Прылёг для спачыну прытомлены лёс
На гонях, барах беларускай зямлі,
Пад чорныя шаты бязмоўных нябёс
Ліцвінскія хлопцы навечна пайшлі.
Тут сёння для смерці багаты ўмалот,
Між Дубіцкіх пушчаў, карчовішч, лясоў,

Між Дубіцкіх рэчак, азёр і балот
Тут Нарбут свой вечны прытулак знайшоў...

*

Не ўсё ён давершыў на гэтай зямлі,
Ды болей, напэўна, не здолеў, не змог,
Ці болей чужынцы яму не далі,
Ці больш не казаў, не судзіў яму Бог.

Ён смела паўстаў на імперыю зла,
І што ж тут такога? Зваліць не здалеў,
Ды гэтая спроба пустой не была,
А быў гэта нашай свабоды пасеў.

*

Свабода ўзышла, як трава, як мурог,
І колькі яе не таптаў чужы бот,
Стаптаць, здратаваць не адолеў, не змог,
Не змог і не зможа ні ў дзень і ні ў год.

Хай крумкае зноўку над Лідай крумкач,
Тут Нарбута памяць у людзях жыве,
І могуць нас нішчыць, касіць і таптаць,
Ёсць вечнасць у нас, як у гэтай траве.

3.03.98 г.

## АПОШНЯЯ МАЛІТВА КСЕНДЗА АДАМА ФАЛЬКОЎСКАГА

*"Ідучы пад расстрэл 24 чэрвеня 1863 года ксёндз Адам Фалькоўскі чытаў малітву з кантычкі..."*

З успамінаў сведак

-- Ойча наш, каторы ёсць на небе...

Даруй адзіны грэх мой, што зрабіў,
Адзін я запавет парушыў твой,
Ты нас вучыў: "Ніколі не забі!".
А я людзей паслаў на люты бой.
Я ім казаў ісці і забіваць,
І рэзаць, нішчыць прыхадняў ліхіх,

Што ў краі нашым хочуць панаваць
І прыгнятаць, о Бог, дзяцей тваіх.

Я ім казаў, што лепш памерці вольным,
Чым у ярме да веку спіну гнуць,
Я ім казаў з амбона на Ішчольне,
Ды так, каб цэлы край здалеў пачуць...

..І адпусці нам нашыя віны, як і мы адпускаем вінаватым нашым...

І адпусці грахі, і ласкаю сваёй
Пакрый герояў гэтае зямлі,
Што сёння ахвяруюцца сабой,
Каб дзеці іх свабоднымі жылі.

...І не ўводзь нас у спакусу...

Не дай , о Божа, нават думкі ім:
Сысці, схавацца, збегчы і счакаць,
Развей сумненняў і ваганняў дым,
Дай сілы ім, каб да канца стаяць,

Прымі іх душы пад сваё крыло
І ў райскі сад ім браму адчыні,
Яны ж паўсталі на ліхое зло
За панаванне вечнай дабрыні.

Даруй, о Божа, грэх адзіны мой
І іх грахі даруй таксама мне,
Няхай ім будзе лёгка прад Табой,
І ласка іх Твая хай не міне...

...Аман.

5. 07. 98 г.

**ВІЦЬБІЧЫ**

Перад напасцю кожнаю
І зграямі варожымі,

Ніколі іх не лічачы,
Пад Грунвальдам і Менскам,
Пад Воршай і Смаленскам
Заўжды ўставалі віцьбічы.

Ад голаду і холаду,
Ад бальшавіцкіх Молахаў,
У модлах Бога клічучы,
Пад ласкаю савецкаю,
Пад палкаю нямецкаю
Цярпелі грозна віцьбічы.

Ды ні за нафту танную,
Ды ні за булку смачную,
Ў сабак вачэй пазычыўшы,
Ні родную старонку,
Ні бацькаўскую мову
Не прадавалі віцьбічы.

6.09.94 г.

## ПАСЛЯСЛОЎЕ ДА СЛУЦКАГА ЗБРОЙНАГА ЧЫНУ

*Слуцкі збройны чын - апошняя спроба беларусаў пад час Грамадзянскай вайны ў Расеі ўстанавіць сваю ўласную ўладу на Беларусі. Пасля паразы двух слуцкіх палкоў ад бальшавікоў рэшткі іх адышлі на польскую тэрыторыю, дзе былі палякамі раззброены.*

Мы стаім у шыхтах скамянела,
Мы ў адчаі жалобна маўчым,
Мала нас, мала нас уцалела,
І закончыўся збройны наш чын.
Адбіраюць палякі вінтоўкі,
Нібы долю і волю бяруць,
Не старыя бяруць дубальтоўкі,
Адбіраюць у нас Беларусь.

Мы паўсталі ад сох і сявенькі
І ад Слуцкіх высокіх званіц.
Мы паўсталі ад роднай зямелькі,
Мы ўскіпелі з крыштальных крыніц.

Мы паўсталі з апошняю спробай
Жыць ва ўласным парадку зямным,
Надарыць край адвечнай свабодай
Зберагчы ад чырвонай чумы.

Не хацелі ні пана, ні хама
Над прадзедаўскай шэрай раллёй,
Гаспадарыць жадалі мы самі
І за гэта паўсталі на бой.

Мы паўсталі былі і разбіты
Бальшавіцкай стаптаны ардой.
Край радзімы, крывёю заліты,
Пакідалі ляжаць за сабой.

Адступалі з надзеяй святою
Сіл набрацца і зноў ваяваць,
А палякі загадваюць зброю,
Нібы нейкім злачынцам, здаваць.

Мы вінтоўкі кідаем у кучу,
І маўчым, і маўчым, і маўчым,
Дагарае ў нас гневам кіпучым.
Гэты наш незакончаны чын.

Дагарае наш чын тарфавіскам,
Толькі іскры, як знічкі, ляцяць,
Ой няблізка той час, ой няблізка,
Як мы з можам з нябыцця паўстаць.
Ды наступіць ён, верым, наступіць,
Хоць самім мо не лёс прычакаць,
Ў незалежнай, святой Беларусі
Будуць косці ўсё ж нашы ляжаць.

24.11.94 г.

## БЕЛАРУСКАЙ ЗЯМЛІ АФІЦЭРЫ

Вецер часу ўзарваў векавечную цвіль,
Шок чырвонай заразы паціху праходзіць,

Над жалобай і пылам заўчасных магіл
Сонца яснае нашай свабоды ўзыходзіць.

Колькі вынішчыў нас гэты злы Трэці Рым,
Колькі нас ён распяў на крамлёўскім бязвер'і,
А мы зноўку ў шэрагах грозных стаім
Беларускай пакутнай зямлі афіцэры.

Нас паслалі дзяды іх пачын завяршаць,
Каб той д'ябал чырвоны павек не вярнуўся,
І не знічкі на нашых пагонах бліщчаць,
А гарацъ на іх слёзы маёй Беларусі.

Слёзы крыўды, што век дратавала яе,
Слёзы жалю за дзетак бяздольных абшараў,
Слёзы шчасця, што ўрэшце наш час настае,
І збываюцца прашчураў светлыя мары.

Іх Касцюшка вучыў, як Радзіму любіць,
Каліноўскі да волі паказваў дарогу,
Мы ж павінны астатняе сёння зрабіць,
Каб суцешыць іх душаў гаротных трывогу.

Каб спакойна маглі ў цішыні спачываць,
У спакоі здзяйснёных надзеі і веры,
Бо на варце іх мараў надзейна стаяць
Беларускай свабоднай зямлі афіцэры.
6.03.93 г.

**ДЗЕ РАНЕЙ МЫ БЫЛІ?**

*Ворагі Беларушчыны аказаліся непадрыхтаванымі да масавага ўздымку беларускага нацыянальнага руху і ніяк не могуць зразумець, як яны прагапілі такую колькасць "нацыяналістаў" і недаўменна пытаюцца: "Дзе раней вы былі", - як бы месца выведаць хочуць.*

Дзе раней мы былі?
Ды баланду па турмах сярбалі,
Па бясконцых этапах брылі

І ў сібірскіх снягах паміралі.

Дзе далей мы былі?
Трохі ў родных палетках і хатах,
Ну а после? У чорнай зямлі,
У праклятых навек Курапатах.

Дзе яшчэ мы былі?
Мы псіхушкі цішком абжывалі,
Ці гарэлку без спыну пілі,
Ці ў адчаі зацятым маўчалі...
Як народ просты наш, мы ўсе так жа жылі.

Ды вось выцяў мароз па чырвонай чуме,
І мы зноўку, нібы вечны Фенікс, паўсталі,
І ўвесь зброд бальшавіцкі ад жаху знямеў,
Бо нас бачыць жывымі даўно не чакалі.

Ну а зараз, як шок з іх паціху сышоў,
Зашыпелі і крык паднялі,
І вішчаць, як пра самы смяротны з грахоў:
"Дзе раней вы былі?"

16.08.93 г.

**ВІКТАРУ ШАЛКЕВІЧУ**

*Віктар Шалкевіч - лепшы Гарадзенскі бард. Артыст і патрыёт. Аўтар песні з радком: "Вуліца, поле, Вялікае Княства..."*

"Вуліца, поле, Вялікае Княства",
З краю самотна Шалкевіч брыдзе,
Сёння спяваў ён з адвагай нянаскай
Ў самую морду вяльможнай брыдзе.

Сёння спяваў ён, а спераду ў зале
З песень яго рагатала брыда,
Скаліла зубы ў звар'ёваным шале
Ў Княстве Вялікім чужынцаў арда.

Ім да спадобы пра жлобскую нац'ю,

Гэдыкай нацыяй лепш кіраваць,
Ім да спадобы, бо тут агітац'і
Супраць чужынцаў зусім не чуваць.

Ім да спадобы. Шалкевіч спявае,
Ды не відно ім, як сэрца гарыць,
Ды не чутно, як гітара ўскіпае,
Кожнай струною, як помста звініць.

Ды не чутно ім. як словаў распяцце
Будзіць народ, пхае ў рукі сахор,
Хопіць брыдзе з нашых слёз пацяшацца,
З песні, як з глебы, ўзрастае адпор.

"Вуліца, поле, Вялікае Княства",
З краю самотна Шалкевіч брыдзе,
Сёння пляваў ён з адвагай нянаскай
Ў самую морду вяльможнай брыдзе.
24.10.94 г.

## МУЛЯВІН СПЯВАЕ "ПАГОНЮ"

*Уладзімір Мулявін, кіраўнік ансамбля "Песняры", пасля таго, як прэзідэнт Лукашэнка павіншаваў яго з 25-годдзем "Песняроў" узяў гітару і выканаў "Пагоню" на словы М. Багдановіча.*

"Толькі ў сэрцы трывожным пачую..."
Зноўку душа трысняжынкай трымціць,
Ловіць адчайна мелод'ю святую,
Вечнай няздзейсненай воляй кіпіць.

Зноўку лунаюць штандары над краем,
Покліч змагання з вятрыскам ляціць,
Зноўку чужынца мароз прабірае,
Зноў беларус чалавекам глядзіць.

*

"Маці родная, маці краіна..."
Рускі Мулявін "Пагоню" пяе,
Рускі Мулявін клянецца быць сынам,

Ўмерці гатовы за крыўды твае.

Рускі Мулявін спявае "Пагоню"
Сэрцам, душою, істотай усёй,
Плача з ахвярнай тугой нестаёнай,
Моліць дарунку ў зямелькі маёй.

*

"Біце ў сэрцы іх, біце мячамі..."
Біце і ў душы, і ў спіну, пад дых,
Біце пакуль не адолее ўцяміць
Кожны значэнне тых словаў святых.

Біце, гняціце ярмом і прымусам,
Біце, як білі, штодня, цэлы век,
Бо ўжо, як сёння не стаў беларусам,
То і не выйдзе з яго чалавек.
30.10.94 г.

## АЛЕСЮ БЕЛАКОЗУ ДА 70-ЦІГОДДЗЯ

*Алесь Белакоз - відны дзеяч беларускага нацыянальнага Адраджэння, стваральнік і дырэктар унікальнага Гудзевіцкага этнаграфічна-літаратурнага музея, заснавальнік Таварыства Беларускай Мовы на Мастоўшчыне. Выкладаў у Гудзевіцкай школе беларускую мову і літаратуру. Пры камуністах за сваю нацыянальна-асветніцкую дзейнасць цярпеў жорсткі перасслед. Але Белакоз не пахіснуўся ні тады, ні зараз. 11 верасня 1998 года яму споўнілася 70 гадоў.*

На гэтай зямлі ганарова быць туркам,
Расейцам таксама не з горшага быць,
Не блага быць немцам, французам, удмуртам
Кітайцам, японцам, ці ўсіх палічыць.
Арабу не кепска жывецца пад сонцам
Ангелец смяецца, не плача і грэк,
І ім не цікава што ў свеце бязконцым
Скрыўджаны ёсць не адзін чалавек.

*

Не будзе на гэтым, на свеце парадку

І ладу не будзе да тога на ім
Покуль імперый парэшткі, астаткі
Будуць тут гніць і смярдзець нам усім.
Б'ецца Ірландыя ў муках за волю,
Баскі аплачваюць волю крывёй,
Курды, пракляўшы і лёс свой і долю,
З трыма аж дзяржавамі сталі на бой.
Хоча свабоды Квябэк ад Канады,
Хоча Шатландыя, волі сваёй ,
Ды толькі ці здолець ці даць усім рады,
Ці Богу патрэбны бясконцы той бой?
Ці Богу патрэбна каб тут пад Мастамі
Семсят гадочкаў адзін Белакоз
Быў беларусам і днямі, гадамі
Адзін Беларушчыну гэтую нёс?
Мы сёння паўсталі, як курды, як баскі,
І нас не стаптаць там за колькі гадзін,
Ну а да тога з Гасподняе ласкі
Быў Белакоз і быў проста адзін.
Мудра і стойка, як камень амшалы,
Не вывернуць гадам, не ссунуць на бок,
Мала такіх было, вельмі замала,
Ды ўсё ж і сюды пасылаў іх Пан-Бог.

*

Мы сёння глядзім на зямлю сваю з болем,
Нас прадаюць, прапіваюць, што дзень,
Ды толькі ніколі, ніколі, ніколі
Мы не папусцімся гэтай бядзе.
Семсят гадоў Белакоз не паддаўся,
Дай жа нам Божа па столькі зрабіць,
Кожны каб так жа, як ён, не хістаўся,
Кожны, як ён, беларусам змог быць.

*

На гэтай зямлі быць не дрэнна індусам,
Ды толькі магу вам пра тое сказаць:
Прыдзе той час: кожны тут беларусам
З гонарам будзе сябе называць.

12.09.98 г.

## МАРШ БЗВ

*БЗВ (Беларускае Згуртаванне Вайскоўцаў) - патрыятычная арганізацыя вайскоўцаў-беларусаў, створаная ў 1992 годзе.*

Адзвінеўшы ў мячах харалужных
Родны край ў паняверцы панік,
Ды ўстаюць, ды ідуць шыхты мужных,
Новых дзён пачынаюць адлік.

Ярылы крыж на тарчы і на лёсе,
Радзіма-маці нас у шыхт заве,
За родны край, за жытняе калоссе
Мацуюць крок харугвы БЗВ.

Мы ўздымаем людскую адвагу,
Будзім веру і ў лёс, і ў сябе
Спаталяем адвечную прагу
Краю волю здабыць ў барацьбе.

А навокал халуйская зграя
Хоча зноў нам навесіць ярмо,
Ды пад нашым штандартам лунае:
"Не дазволім! Не быць! Не дамо!"

Цяжкім крокам мы грымнем на бруку,
Сотні сэрцаў заб'юцца мацней,
Долю краю ва ўласныя рукі
Возьмем мы дзеля шчасця дзяцей.

Ярылы крыж на тарчы і на лёсе,
Радзіма-маці нас у шыхт заве,
За родны край, за мовы разгалоссе
Ідуць на бой харугвы БЗВ.

30.10.94 г.

## БЕЛЫ ЛЕГІЁН

*"Белы легіён" - патрыятычная радыкальная моладзевая арганізацыя, створаная у 1995 годзе.*

Не чакай нас, мама,
З хуткім цягнікам,
Не пільнуй нас, мама,
За піўным ларком.

Мы не носім, мама,
Гальштук і пінжак,
Не малюе, мама,
З нас карцін мастак.

Нас не лашчыць, мама,
Летні вецярок,
Па-над намі, мама
Беспрасветны змрок.

Чорнае сонца,
Белы легіён.
Разганяйце, хлопцы,
Летургічны сон.
Па маёй старонцы
Б'е набатны звон.
Чорнае сонца,
Белы легіён.

Не шукаем, мама,
Мы ў лясах рублі,
Мы шукаем, мама,
Волю для зямлі.

Мы шукаем, мама,
Край свой дарагі,
Разрываем, мама,
Путы, ланцугі.
Мы варожай, мама,
Кровачкі пап'ём,
На хаўтурах, мама,
Весела спяём.

Чорнае сонца,
Белы легіён.
Разганяйце, хлопцы,

Летургічны сон.
Па маёй старонцы
Б'е набатны звон.
Чорнае сонца,
Белы легіён.

Сустракай нас, мама,
У густых шыхтах,
Прывітай наш, мама,
Пераможны сцяг.

Бо мы прыйдзем, мама,
Раз і назаўжды,
Не спазнаеш, мама,
Болей ты бяды.

Ты шчэ ўбачыш, мама,
Светлы ясны дзень,
А пакуль нас, мама,
Не шукай нідзе.

Чорнае сонца,
Белы легіён.
Разганяйце, хлопцы,
Летургічны сон.
Па маёй старонцы
Б'е набатны звон.
Чорнае сонца,
Белы легіён.

31.07.96 г.

* * *

Хай прыдзе вораг і заб'е мяне,
Я пацяку гаручаю крыніцай,
Няхай тады ён хоць глыток глыне,
Хай паспрабуе ён вады напіцца.

Хай прыдзе вораг і заб'е мяне,
Я прарасту высокаю травою,

Няхай тады ўва мне ён адпачне,
Хай у мяне ён ляжа галавою.

Хай прыдзе вораг і заб'е мяне,
Я пылам стану і пяском сыпучым,
Няхай тады нагой мяне кране,
Ці пылам тым дыхне лятучым.

Хай прыдзе вораг і заб'е мяне,
Я ўскалашуся жытам шапатлівым,
Няхай тады ён на капе прысне,
Ці хлеба паспытае з тога млiва.

Хай прыдзе вораг і заб'е мяне,
Я разлячуся песняй баявою,
Тады навек ён дзень той пракляне,
Калі звязаўся быў са мною.

10.04.94 г.

* * *

Так, скіфы мы, так, азіяты - мы
з раскосымі і прагнымі вачамі.
А. Блок.

Так, мала нас,
Так, беларусы - мы
З раскіслымі і вялымі мазгамі.
Знішчалі нас,
І ўсталі мы
З нахабнымі і прагнымі вачамі.
Вазьміце нас
І збіце ў кроў,
Палонную мы ведаем навуку,
Мы ўсталі раз,
Мы ўстанем зноў
І возьмем зноўку зброю ў руку.

Зваюйце нас,
Злажыце ў дол
І пасячыце ў дробныя ашмёткі,

Праз дробны час,
Як пырнік, зноў
Мы ўзыдзем разам з помстаю салодкай.

Вам Юда - бог,
Вам здрада - смак,
А нам свабода роднае краіны,
Паможа Бог,
І будзе так,
Для вас не хопіць у лясах асінаў.

І будзе так,
Не прыме вас
Зямля ў сваё святое ўлонне.
І будзе так,
І прыдзе час,
І будзе нас шмат болей, чым сягоння.

І будзем мы,
Бо беларусы мы,
А вас не будзе нават успаміну.
Радзімы край,
Твае сыны
Нідзе, ніяк, ніколі не загінуць.

10.04.94 г.

**МЫ -- НАЦЫЯ ВОЛІ**

Па пылу стагоддзяў,
па муках і болю
Мы ўрэшце выходзім
да шчасця і волі.

Мы - нацыя смелых
і Богу адданых,
Мы з рук анямелых
зрываем кайданы.

Над намі імкліва
грукоча Пагоня,

Мы нашую прышласць
ствараем сягоння.

Мы - нацыя слаўных
прадзедаўскай славай,
На злыдняў нахабных
мы знойдзем управу.

Мы створым краіну
агульнага шчасця,
Навечна пакінуць
нас гора, напасці.

Не сцерпім мы болей
ніколі прымусу
Мы --нацыя волі,
бо мы - беларусы.

8.07.93 г.

# Нясвіж

*У 1223 годзе нясвіжскі князь Юры загінуў у бітве з татарамі на рацэ Калка.*

### 1. ВЫПРАЎЛЯЕЦЦА РАЦЬ

Веюць горда сцягі,
Ціха дзіды звіняць,
За дажджы, за снягі
Выпраўляецца раць.

Пакідае Нясвіж
Смелы князь малады
Не на дзень, не на міг-
На гады, на заўжды.

Пакідае сыноў,
І княгіню сваю,
І магілы бацькоў,
І радзімы зямлю.

Грае чырвань і сталь,
Коней нельга суняць,
У бясконцую даль
Выпраўляецца раць.

Чорны сцяг над палком,
Нібы казачны птах,
Шыты ўвесь серабром
Рэе ў цвёрдых руках.

Недзе там дзікі Ўсход,
Недзе вораг ідзе,
Невядомы народ
Цар крывавы вядзе.

"Нашы землі забраць,
Хоча нас паланіць..."

Выпраўляецца раць,
Рушыць ворага біць.

Рвецца ранняя ціш,
Грозна трубы гудуць,
Йдзе маленькі Нясвіж
За вялікую Русь.

24.01.85 г.

## 2. КАЛКА

Бітва мела канец без пачатку,
З похваў шчэ не дасталі мячоў,
Як не стала наўкола парадку
Між прывычных да сечы палкоў.

Шчэ стаяць нестамлёныя коні,
Не растрачана сіла ў руках,
І нікога нікуды не гоніць
Непрывычны для воінаў страх.

А вакол цецівою напятай
Цішыня. І дзе вокам ні кінь -
Неўспрымальнаю мрояй заклятай
Ўсцяж віруе мангольская плынь.

Набягае за хваляю хваля,
Аб чырвоныя б'ецца шчыты,
То страшэннаю масаю валіць,
То знікае, як пырскі вады.

Прапануюць манголы здавацца,
Склаўшы зброю дадому ісці,
Пачынаюць кіяне хістацца,
Павуціну сумненняў плясці.

Сем князёў, апусціўшы забралы,
Мужна сталі наперад палкоў,
І спрадвечнай адвагай зайграла,
Закіпела славянская кроў.

"Ты ўжо, кіеўскі князю,
На нас выбачай,
Ці праб'ёмся дадому,
Ці трапім у рай"

Сем дружын у варожую зграю,
Як у цеста імкліва ўвайшлі,
Сем цымбалаў жальбы і адчаю
Зазвінела на рускай зямлі.

"Ты ўжо, кіеўскі князю,
На нас выбачай,
Ці праб'ёмся дадому,
Ці трапім у рай"

Закіпела адчайная сеча,
Як тараны дружыны ідуць,
А кіяне наладзілі веча,
Зброю! Зброю на землю кладуць.

Схіляецца дзень да змяркання,
Ды ўжо сілаў даўно не стае,
І чарнігаўцы, і нясвіжане
Побач сцелюць галовы свае.

Сонца коціцца нізенька-нізка,
За пагоркаў хаваецца тын,
Падае, падае Юры Нясвіжкі
На гарачы, прагорклы палын.

"Ты ўжо, кіеўскі князю,
На нас выбачай,
Не дайшлі мы дадому,
То трапім у рай"

Сем князёў засталіся навечна
Там з дружынамі разам ляжаць,
І далёкі, іскрысты Шлях Млечны
Будзе шлях душам іх асвятляць.

9.06.93 г.

**РАДЗІВІЛЫ**

Народа напятыя жылы -
Радзівілы.

У полі чужынцаў магілы -
Радзівілы.

П'янюгі, гулякі, куцілы-
Радзівілы.

Краіны нязломныя сілы -
Радзівілы.

Імперый пад'ёмы і схілы-
Радзівілы.

І смерць за радзімы край мілы-
Радзівілы.

Вось шалі Феміда хістае ў руках,
Вецер праўды здзірае хлусні брудны друз,
І род Радзівілаў зноў ззяе ў вяках,
Як слава і гонар твае, Беларусь.
7.06.93 г.

**ТРАГЕДЫЯ**
**Мікалая Радзівіла Чорнага,**
**або рэфармацыя ў Нясвіжы**

У Нясвіжы было надта проста,
Радзівіл быў тут Кальвін і Гус,
Быў і Лютар і, скажам па-просту,
Быў мясцовага рангу Ісус.

Ён і веры мяняў тут і ўклады,
Ён хрысціў, як Хрыстос, свой народ,
Ад свае неабсяжнае ўлады
Ён найбольшы чакаў умалот.

Ён адзін быў відушчы ў краіне,
Ён адзін мог наперад глядзець,
Бачыў ён, як з пальшчызны край гіне,
Бачыў ён, што за гэтым ідзе.

Будаваў кальвінісцкія зборы
І да веры людзей намаўляў,
А сляпых у сярмяжным уборы
Пугай трохі яшчэ падганяў.

Як пастух той збірае свой статак,
Князь збіраў свой народ у адно,
Каб паўсюль і з палацаў, і з хатаў
Неба тое ж было ўсім відно.

Князь збіраў свой народ перад бурай,
Што падпоры Зямлі растрасе,
А ўжо ўкрыты авечаю шкурай
Езуіт, як гадзюка паўзе.

Князь стварае і кнігі, і школы,
А змяя каля сэрца ляжыць,
Раз за разам паціхеньку коле
Перад тым, як смяртэльна ўкусіць.

Езуіцкай спытаўшых атруты,
Дзеці князя - не дзеці яму,
Край свабодны, народ свой раскуты
Зноўку пруць у палон, у турму.

І гарацъ кальвінісцкія зборы,
Нема кнігі крычаць у агні,
Асядае іх попел, як гора,
Па ўсім краі, куды ні зірні.

І народ уцякае са страху,
Хто ў касцёл, хто назад у царкву,
Хто пад пугу, а хто і на плаху.
Старшны сон паўстае наяву.

А ў Нясвіжы ізноў усё проста.

Новы князь тут за папу свяцей.
І заўважым яшчэ раз па-просту,
Зноўку хрысціць тутэйшых людзей.
7.06.93 г.

## Сымон Будны

Вось ён! З кнігай паднятай высока
Ля касцёла сягоння стаіць
І глядзіць у стагоддзі глыбока,
Дзе яго так хацелі спаліць.

Дзе яго вечным пеклам пужалі,
Дзе былі ўсе супроць аднаго,
Дзе ксяндзы, як асіны, дрыжалі
Ад вялікае праўды яго,

Што не ў небе Бог дзесь спачывае,
Што ён з веку жыве між людзей
І на мове на іх размаўляе,
Ён і ў шчасці з людзьмі, і ў бядзе,

Ходзіць босы па свежым пакосе,
І з сахою за коньмі ідзе,
І з калекам на паперці просіць,
І харугвы на злыдняў вядзе.

Бог яшчэ - гэта песня на полі,
Гэта клёкат буслоў на вярбе,
Гэта вера і ў долю,і ў волю,
Гэта моцная вера ў сябе.

Не сышоўся з ксяндзамі ў дыскуссі,
І адзін яму вырак - спаліць,
Ну а сёння ў маёй Беларусі,
Як святы, ля касцёла стаіць.

І зважаюць яго за святога,
І святым ён павінен быў быць,
Бо, іначай, ці здалеў бы Бога

Ён між грэшных людзей пасяліць.
7.06.93 г.

## НЯСВІЖ

Там, дзе стагодзі зламаліся ў скрусе,
Там, дзе густая, адвечная ціш,
Там ў самым сэрцы маёй Беларусі,
Ты песня мая, мой радзімы Нясвіж.

Буслам бялюткім, свабоды птахам
Ты па-над пылам стагоддзяў ляціш
Пад бела-чырвана-белым сцягам,
Мой старажытны і вечны Нясвіж.

З-пад брамаў тваіх вылятала Пагоня,
І вёў Радзівіл на маскоўцаў палкі,
Тут сечаў крывавых яшчэ рэха звоніць,
Тут шэпчуць легенды сівыя вякі.

Званіцы твае абвяшчалі Сусвету
І новую веру, і літасці час,
І Будны - прадцеча вялікіх паэтаў
Тут вешчыя думы выношваў для нас.

Тут Колас адшукваў чароўныя словы,
Што проста за сэрца і душу бяруць,
Тут з нетраў народа ўздымаецца мова,
Дзяржаўная мова твая, Беларусь.

Буслам бялюткім, свабоды птахам
Ты па-над пылам стагоддзяў ляціш
Пад бела-чырвана-белым сцягам,
Мой старажытны і вечны Нясвіж.
7.06.93 г.

# Наш Грунвальд. Вянок санетаў

## 1. Шыхт

Мы стаім у шаломах з мячамі,
Перад намі варожая рацць,
З намі мова,зямля наша з намі,
За яе мы ідом ваяваць.

Мы ўглядаемся ў проразі грозна,
Мы вышукваем хібу ў бранi,
Ад жалезнага цяжару млосна,
Божа, нас ты хаця барані.

Вытнем разам, магутна, зацята,
Будзем біцца, як косім, заўзята,
У крававай рацэ той шалёнай
Палымнеюць агнём берагі,
Перад намі - праклёны, праклёны,
Па-над намі - сцягі і сцягі.

1.10.90 г.

## 2. Пачатак

Па-над намі - сцягі і сцягі
Чырвань бель паласою пячэ,
А навокал снягі і снягі,
Кроў чырвоная густа цячэ.

За снягамі ваўком вые ноч.
Зубы вострыць злаюдава рацць,
Моцны Божа, хаця не суроч,
Дай жа трапна варогаў уцяць.

Нам няведамы страх у баі,
Мы забылі каханых сваіх,
На шчытах толькі вольнасць у нас,
Вораг падае ніц пад мячамі,

Нам не страшны ні суд і ні час,
У нас крылы даўно за плячамі.

1.10.90 г.

### 3. Прызямленне

У нас крылы даўно за плячамі,
Ды мы звяжам іх моўчкі, што моц,
І самотнымі зорак вачамі
Распагодзім бясконцую ноч.

Па зямлі сваёй грэшнай нагамі
Мы адмераем кожную пядзь,
Мы вятры супакоім сцягамі,
І шчытамі мы высцелем гаць.

Між баямі самотнай хвілінаю
Мы зліёмся з зямлёй, як з дзяўчынаю,
Вольны вецер пяе аб свабодзе,
Неба нам, як акрайчык страхі,
Нам не ўзлезці туды, мой народзе,
На нагах цяжкай гірай грахі.

5.10.90 г.

### 4. Будні

На нагах цяжкай гірай грахі,
А ля скроні, як руля, праклён,
Мой народзе, табе ад сахі
Трэба выйсці да велічных дзён.

Ты, забіты нядоляй і працаю,
Аж забыўся на назву сваю,
І штодзень бізуном альбо тацаю
Кроў па кроплі ўсе ціснуць тваю.

А мы ўсё ці аралі, ці сеялі,
Рукі цешылі працай умелаю,
Забываліся мроямі чыстымі,

Ды пабудка, як дзень, наступала,
Нібы хваляў сцяна перад выспамі,
Перад намі варогаў навала.

5.10.90 г.

**5. Вораг**

Перад намі варогаў навала,
Як стагодзі меняюць іх твар,
Ды душа перамен не спазнала,
Не згасае там хцівасці жар.

Хоць там немец, хоць лях,хоць расеец,
Іх аднолькавы точыць чарвяк,
Зразумець не жадаюць, не ўмеюць:
Тут не рускі жыве, не паляк.

Тут жывуць беларусы спрадвеку,
Церпяць тут і канаюць ад здеку.
Новы дзень зноў бядой узгарае,
Б'е маланкай па гэтым краі,
Новы вораг сюды падступае,
Там чужынцы, тут жменька сваіх.

5.10.90 г.

**6. Нечысць**

Там чужынцы, тут жменька сваіх,
Там нахабная, лютая зграя,
Што чужынцы? Вядома, ад іх
Мы ўсялякага ліха чакаем.

Што чакаюць, адкажы , Беларусь,
Нам ад злыдняў табой спараджоных,
Што па частках цябе прадаюць,
Што табе пагражаюць палонам.

Паглядзіце, як нечысць шыкоўна
Тут жыве, бы ў раі, усяроўна,

Раскашуе на шыі народа,
Наша гора, наш боль растаптала,
У кайданы ўкавала свабоду.
Як нас мала, мой Божа, як мала.

4.02.91 г.

**7. Адраджэнне**

Як нас мала, мой Божа, як мала,
Не ўрадзіла нас болей зямля,
Кепска сонца яе саграваала,
І была ўся з камення ралля.

Мы па каліву цяжка ўзрасталі,
Нас ламаў, нас таптаў градабой,
Мы ў сібірах сябе пахавалі,
На вайне заліліся крывёй.

Ды ад кожнай сцяблінкі спрадвеку
Хоць зярнятка хавалі ад здеку,
І вось "трубы гудуць над Гародняй",
Менск пагонічаў кліча сваіх,
Мы-жывыя, хай нават і сёння,
Як заўсёды, нас меней, чым іх.

4.02.91 г.

**8. Досвітак**

Як заўсёды, нас меней, чым іх,
Як заўжды, у нас горшая зброя,
Нам падмогі няма ад святых
І няма нам спагады людское.

Шлях замкнула гісторыя свой,
Інсургентаў калісь прадавалі,
А сягоння бязмоўнай гурбой
Галасы недавяркам аддалі.

Бач, абселі наўкола панамі,

Бач,камандуюць велічна намі,
Ды такі ненадоўга хаўрус,
Новы дзень, новы час наступае,
Мы ўстаём за сваю Беларусь,
Таўкавіска ад зброі зіяе.
23.02.91 г.

**9. Мэта**

Таўкавіска ад зброі зіяе,
Таўкавіска сцягамі гарыць,
Наша справа ў той бітве святая,
Мы радзіму ідом бараніць.

Ад пагарды ідом, ад бязволля,
Ад спакусы пакорай раба,
Ад бязвер'я, душэўнай няволі...
Тут за прышласць зямлі барацьба.

Жыцці мы ўжо даўно паламалі,
Сэрцы ў латы стальныя ўкавалі.
Мы супроць той пакоры лядачай,
Што народ мой з жывёлай раўняе,
З нашых душаў і сэрцаў гарачай
Таўкавіска крывёй заплывае.
23.02.91 г.

**10. Поле**

Таўкавіска крывёй заплывае,
Ды за шыхтам зноў шыхт устае.
Год за годам Пагоня збірае
Нас пад светлыя сцягі свае.

Год за годам зямля Беларусі
Пасылае ўсё новых сыноў,
І ні мукі, ні смерць не прымусяць
Іх адгэтуль вярнуцца дамоў.

Наша поле ляжыць не пад Менскам,
Не пад Вільняй, Варшавай, Смаленскам,
Душы, сэрцы, надзея і гнеў,
Беларусь, поле тое - мы самі,
Крумкачоў чуцен жудасны спеў,
Мы за край свой кладомся касцямі.

23.02.91 г.

## 11. Неўміручасць

Мы за край свой кладомся касцямі,
Толькі душам спачыну няма,
Зыркай помсты святымі агнямі
Ім зігцець у бязмежжы цямна,

Ім лятаць, ім блукаць у прасторы,
Новых целаў рупліва шукаць,
Душы тых, хто загінуў учора
Заўтра будуць ізноў ваяваць.

Вольны дух Беларускай краіны,
Ты не знік, не прапаў, не загінуў,
Ты ў Сусвеце бязмежным лунаеш,
І гадуеш сыноў ты сваіх,
Светлай мараю нас асвятляеш
У тым нашым апошнім баі.

11.09.91 г.

## 12. Стойкасць

У тым нашым апошнім баі,
Колькі б злыдням ні рвацца, ні пяцца,
Мы патонем у моры крыві,
А назад ні адзін не падасца.

Не саступім не пядзі зямлі
І ні слоўца радзімае мовы,
Мы сцягі не на жарт паднялі,
Не на дзень мы скідалі аковы.

Родны край, ты адзіны на свеце,
Мы ж усе - твае грэшныя дзеці.
За свабоду тваю і за шчасце
Мы ў адказе і толькі мы самі,
Тварам стрэпем любыя напасці.
Наша крыўда... Яна перад намі.

11.09.91 г.

### 13. Праклён

Наша крыўда... Яна перад намі,
Нашы ворагі ладзяць хаўрус,
Як ваўкі, зноў скрыгочуць зубамі,
Сцеражыся, бядак-беларус.

Камуніст і расеец натхнёна
Дзеляць нашу святую зямлю,
І гразяць нам апошнім палонам,
І звіваюць на шыю пятлю.

Дык праклятым хай будзе маўчанне,
Ласкі нечай сляпое чаканне,
Хай праклёны на ўсіх тых да скону,
Хто шчэ ў нашых шыхтах не стаіць,
Мы ўстаўём на Зямлі абарону,
Мы зракаемся месца ў раі.

11.09.91 г.

### 14. Грэх

Мы зракаемся месца ў раі,
Мы даўно саграшыць не баімся,
Мы свабодны ва ўчынках сваіх,
Ад ратунку душы адракліся.

З сэрцаў вырвем спагаду і жаль,
Перад выбарам сродкаў не станем,
Нас не можа абцяжваць мараль,

Нас дабром немагчыма параніць.

А на шалю грахоў на тым свеце
Грэх адзін нам не ляжа, паверце,
Грэх пакоры, бязвер'я, адчаю,
Здрады грэх не запішуць за намі.
Перад лёсам радзімага краю
Мы стаім у шаломах з мячамі.

11.09.91 г.

## 15. Бой

Мы стаім у шаломах з мячамі.
Па-над намі - сцягі і сцягі,
У нас крылы даўно за плячамі,
На нагах цяжкай гірай грахі.

Перад намі варогаў навала,
Там чужынцы, тут жменька сваіх,
Як нас мала, мой Божа, як мала,
Як заўсёды, нас меней, чым іх.

Таўкавіска ад зброі зіяе,
Таўкавіска крывёй заплывае.
Мы за край свой кладомся касцямі
У тым нашым апошнім баі.
Наша крыўда... Яна перад намі,
Мы зракаемся месца ў раі.

1.10.90 г.

# Беларуская вясёлка

*У адрозненне ад усяго свету на Беларусі вясёлка мае не сем, а восем колераў. Восьмы - чорны.*

**Рагнеда**

Над чыстым Рубонам,[1]
Як ружа, цвіла,
Пад грозным "Рубонам"[2]
Княжною расла,

Кахала аддана,
Каханнем жыла,
Адзінай, жаданай,
Святою была.

Сватоў дастаслаўных
Сказала прагнаць,
Чужых, не каханых
Не ёй раззуваць.

Бясстрашна стаяла
Пад ветрам мячоў,
Да ног не прыпала
Чужых ваяроў.

Узятая ў бітве
З мячом у руках,
На ворага ў путах
Наводзіла жах.

Была паланянкай,
Рабыняю - не.
Згарэла маланкай
У вечнай вайне. студзень 1985 г.

---

[1] Рубон - полацкая назва Заходняй Дзвіны
[2] "Рубон" - баявы покліч палачан, аналаг мангола-расейскага "Ура"

* * *

Непаўторная,
Непакорная,
Беларусь мая сінявокая,
Срэбназорная,
Васільковая,
Незабыўная і далёкая.
11.01.85 г.

**Краіна замкаў**

*У сярэднявеччы на Захадзе Беларусь называлі Краінай замкаў з-за вялікага іх мноства на нашай зямлі.*

Краіна замкаў, краіна вежаў,
Краіна грозных сівых муроў,
Краіна частых крывавых межаў
Зямель князёў, каралёў, цароў.

Краіна бітваў, баёў, паўстанняў,
Краіна вогнішч і рэк крыві,
Краіна доўгіх, чужых збытканняў
Над імем нават самай зямлі.

Краіна гневу, краіна сілы,
Краіна вострых сякер, мячоў,
Краіна мноства крыжоў пахілых
Уздоўж шырокіх яе шляхоў.

Краіна мужных хлапцоў-асілкаў,
Краіна верных дзяўчат-красунь,
Краіна вечнай жыццёвай сілы,
Кахання, шчасця, пявучых струн.

Краіна працы, краіна славы,
Краіна волі, што не сагнуць,
Краіна мары жывой, яскравай,
Краіна з назваю Беларусь.
12.01.85 г.

## Беларускі санет

Прыдушана глыбай - скалою,
Аплецена дротам калючым,
Сцякала апошняй крывёю
Пад крыгай нядолі пякучай.

Ні кроплі спагады людское,
Ні каліва божае ласкі,
Ні сілы, ні веры святое,
Ні, нават, пра лепшае казкі.

Ты гінула моўчкі і ціха,
Ды неяк з-пад каменя ліха
Раз кропля крыві, як зярнятка,
На глебу засмяглую ўпала
І ружай калючай і ўпартай
Мая Беларусь зноў паўстала.

13.02.91 г.

## Вялікоднае

Над зямлёй Беларусі крыжы,
Як вяртанне да дзедаўскай веры,
Як адход ад смяртэльнай мяжы,
Як уцёк ад чырвонай хімеры.

Над зямлёй Беларусі буслы,
Як прадвеснікі шчасця і волі,
Як нябёсаў святыя пасլы
Па стагоддзях і мукаў, і болю.

Над зямлёй Беларусі Ісус,
Як надзея яе і імкненне,
Бо яшчэ ж на крыжы Беларусь,
Шчэ чакае свайго ўваскрашэння.

12.04.93 г.

**Дзядуля**

*"Некаторыя старыя адмаўляюцца пакідаць родныя мясціны заражаныя ў выніку Чарнобыльскай катастрофы".*

(З газет.)

Дзень сышоў, засвяціліся зоры,
Росы ўпалі на зелень травы,
Лес у новым барвяным уборы
Скалыхнуўся ад крыку савы.

І лясун, дрыжычы з халаднечы,
Стаў нацягваць паддзёўку з кары,
А ў хацінцы ўжо дровы пры печы
Зачакаліся тое пары,

Як дзядуля нядужай рукою
Трохі засланку ссуне на бок,
Жар паправіць старой качаргою,
Абапрэцца рукой на кіёк

І падкіне паленца, другое,
І агенчык заскача па іх
І павее такой цеплынёю,
Падабрэюць аж лікі святых.

Прапаліўшы так крышачку ў печы
Дзедка юшку засуне, затым
Ён прытуліць старэчыя плечы
Да ласкавых, пяшчотных цаглін,

І павольна, павольна, пaціху
Павядзе ён гаворку сваю
Пра жыццё і няўмольнае ліха,
Што напала на гэту зямлю.

...Тут было так прыгожа і міла,
Смех дзіцячы будзіў цішыню,
І зямелька спрадвеку карміла
Можа ў пяць пакаленняў радню.
Тут быў хлеб і, як кажуць, да хлеба,

Тут і чарку пускалі кругом,
Тут зважалі на лес і на неба,
Тут дабро нажывалі гарбом.

Тут жылі і хацелі да скону
Тут бы жыць, працаваць і кахаць,
Тут на гэтай зямлі абарону
Ім не раз давялося ўставаць.

Ды, раптоўна, адкуль што ўзялося?
Захварэлі і лес, і вада,
Захварэла на полі калоссе,
Грыб з'ясі, і ад тога бяда.

Кажа, недзе ўзарвалася нешта,
Кажа, ўпаў тут нягэдыкі дождж,
Кажа, ўсё тут прапала дарэшты,
Кажа, будзе тут вечная ноч.

Ад дажджу і ад гэтага ліха
Ўсіх павезлі кудысьці за свет,
Ну а ён вось застаўся і ціха
Сам сабе тут жыве божы дзед.

Што яму? Ён нажыўся без меры,
І без меры намучыўся ён,
Ён заўсёды ў найлепшае верыў,
Ды не многа такіх згадваў дзён.

...Ён кабылцы сваёй, што ў калгасе
Ўжо з паўгода агульнай была,
Сечку трохі мукою прыкрасіў,
Ну а Маня аб тым данясла.

Пяць гадоў ён гадзіна ў гадзіну
Ведаў толькі рыдлёўку і лом,
А вярнуўся ў старую хаціну
І зажыў неўпрыкмет за сялом.

Зноўку шчасце не доўга трывала,
Немец вайну пачаў і пайшло -

Накаціла фашыстаў навала
І спалілі аднойчы сяло.

Ён уцёк, па балотах хаваўся,
Нейк раз партызан напаткаў,
Пры атрадзе тады і застаўся,
Як работу рабіў - ваяваў.

Па вайне будаваўся і хату
Зноў паставіў вось тут ля сяла,
Не меў часу хадзіць да дзяўчатаў,
Да яго раз Алена прыйшла.

Ажаніўся. І дзеці, і ўнукі
Параслі, пачалі самі жыць,
І каравыя чорныя рукі
Мелі поўнае права спачыць.

Ну, але як ты сядзеш на покуць,
Трохі ёсць яшчэ сіла ў руках,
Хоць баліць куляй мечаны локаць,
Ды мо прыцемак нейкі ў вачах.

...Ну,а зараз? Адзін, як зязюля,
Трэцца хіба аблезлы шчэ кот,
Сам з сабою гаворыць дзядуля
Люльку з вечара ўціснуўшы ў рот.

На палатках ў цемры стаіўся
Маладзенькі засім дамавы,
Бо стары па вясне атруціўся,
З радыяцыяй з'еўшы травы.

Дамавы падслухоўвае дзедку,
Непрыкметненька вучыцца жыць,
Бо адзін ён застаўся, хто ўлетку
Будзе гэту зямельку лячыць.

29.10.89 г.

**Невядомы паэта**

*Памяці Міхася Явара.*

Там у вёсцы здавён невялічкай
Па-над Нёмна струной гаманлівай
Недалёка ад шэрай каплічкі
Невысокім пагоркам магіла.

Там спачыў пад блакітам высокім
Невядомы нікому паэта,
Як яму, як яму адзінока,
Ды сягоння наш сказ не пра гэта.

I
Быў калісьці ён хлопцам удалым,
Песні пеў, як ніхто тут ніколі,
І прасторы яму не ставала,
Не ставала свабоды і волі.

Не хапала паэце кахання,
Не ставала сінечы нябёсаў,
Думкі рваліся ў далеч блукання,
Крокі стылі ў сярэбраных росах.

Невядомы ў далёкім Сусвеце,
Меў ён дар не падлеглы нікому,
Быў славуты і слынны паэце
Ўсё ж на многія вёрсты ад дому.

Тут любілі яго шанавалі,
Тут патрэбны ён быў для народа,
Тут яго ў грамадзе паважалі
За тых песень яго асалоду.

Ды не стала аднойчы паэты,
Сціхлі песні яго назаўсёды,
І магільным пяском разам з гэтым
Верш паэты засыпалі годы.
Шчэ засыпалі мару, і веру,
І да высяў нябесных імкненне,

Стаў паэта нязнаным жаўнерам
Векавечнае бітвы натхненняў.

II
Ён пахованы быў і адпеты,
І, здаецца, што болей сказаць,
Ды ўся сутнасць у тым, што паэты
І па смерці не могуць маўчаць.

Іх магілы па ўсёй Беларусі,
А іх песні ў народа ў душы
І, напэўна, таму толькі мусіць,
Колькі нас хто ні біў, ні душыў,

Колькі нас не зжывалі са свету
Праз вякі, што ні дзень, што ні год,
Мы таму, што раджалі паэтаў,
Засталіся ў жывых, як народ.
8.07.93 г.

***

Беларусы-братачкі,
Што ж мы нарабілі?
Гэта ж нашы прадзеды
Сусаніна забілі.

Гэта нашы дзедачкі
Паміж шабель звону
Узялі ды ляснулі
Князь-Баграціёна.

Ну а нашы дзядзечкі,
Хлопцы не такоўскія
Ненарокам стрэльнулі
Нейкага Катоўскага

І бацькі не лепшыя,
Напіліся ў друз,
Па два літры ўкінуўшы

Прапілі Саюз.
Беларусы - братачкі,
Хлопцы маладыя,
Скіньма па тры грошыкі
Да купем Расію.
12.05.94 г.

**Купалле**

З гарадскіх кватэраў і сялянскіх хатаў,
Па асфальце гладкім, сцежкай, напрасткі
Дружна рушаць наднямонскія дзяўчаты
Да сваёй вялікай, добрае ракі.

У цішы паганскай векавечных пушчаў
Разбяруць на долькі трапяткія сны,
Скінуць пыл стагоддзяў у начы відушчай,
Зробяцца ліцьвінкамі з даўняй даўніны.

Заплятуць вяночкі з кветак гаманлівых
І пашлюць па Нёмну прышласць варажыць,
І рака паманіць доляю шчаслівай,
І рака падкажа, як ім далей жыць.

Кветку хай не знойдуць, ды пад вербаў шатай
У вадзе адбітак згледзіць не адна,
І паверадь шчасцю нашыя дзяўчаты,
І паверыць шчасцю наша старана.

Варажыце,варажыце,
папарадь шукайце,
Варажыце,варажыце,
доля ў нас адна

Знойдзеце вы долю,
знойдзеце вы шчасце
Знойдзе шчасце - волю
наша старана.
24.07.93 г.

**Ода**

*З нагоды прыняцця*
*двухгаловага арла ў якасці герба Расеі.*

Мутант расейскай дэмакратыі,
З дзвюма мазгоўнямі арол
Па-над трупярняй партакратыі
Крыллё памятае прасцёр.

Зірнуў на свет падбітым вокам,
З хваста страсае нафталін,
Кіпцё выцягвае шырока,
І тры кароны зноў над ім.

Ён зноў і скіпетр, і "дзяржаву"
Грабе прывычна да сябе,
Ён сам табе - закон, і права,
І канстытуцыя табе.

Ён мае сэнс такі вялікі,
Што без бінокля ўсім відзён.
Ён,як сама Масква, двухлікі,
І, як Масква, драпежны ён.

Краіны зноў глытаць гатовы,
Дзяўбсці чужы і свой народ,
І нездарма яго галовы
Глядзяць на Захад і на Ўсход.

Ды ў тым, якраз, і ёсць надзея
Бяды пазбавіцца сяк-так,
Галовы ж бо, як два зладзеі,
Не могуць змовіцца ніяк.

Адна аж плішчыцца ў Еўропу,
Другой жа Азію давай,
Таму праз той сусветны клопат
Да нас яшчэ ім мала спраў.

Таму шапчу вам з той нагоды,

Не суцяшаючы дарма:
"Жывеце, хлопцы, покуль згоды
Паміж галовамі няма".

31.03.94 г.

## Спадарыні

На пачатку зямное існасці,
На шляху да дзяржаў вялікасці
Свеціць нам , як мадоннаў лікамі,
Беларускіх жанчын краса.
Нараджалі асілкаў- віцязяў,
Гадавалі тытанаў - кніжнікаў,
Абжыналі абшары жытнія,
Ткалі золата ў паясах.

Марылячкі і Ганначкі,
Алесячкі і Вандачкі,
І косы ніжай плеч,
Пад Грунвальдам і Воршаю
Перад Масквой і Польшчаю
Нам падавалі меч.

Абуджалі ад сну дрымотнага,
Навярталі да лёсу добрага,
Мілавалі да краю роднага
Ў кожнай хаце маёй зямлі.
Праклінаді за слабасць здрадную,
Ахіналі тугой спагаднаю,
Кіравалі рукой уладнаю,
Як вяргінячкі ўсе цвілі.

Мы дабрыню жаночую
І прыгажосць дзявочую
Ў душы спрадвек нясём,
Не "пані" і не "барыні",
А ласкава "спадарыні"
Дзяўчат сваіх завём.

Падымалі на рацць крывавую,

Надзялялі пашанай славаю
І лячылі жывымі травамі
Збітых, зраненых у баі,
І кахалі з усёй адданасцю,
І кахалі ажно без памяці,
І ва ўсякай жыццёвай замяці
Вернасць любаму берaглі.

Марылячкі і Ганначкі,
Алесячкі і Вандачкі,
Пячэ пагляд агнём,
Не "пані" і не "барыні",
А ласкава "спадарыні"
Дзяўчат сваіх завём.

5.09.94 г.

**Ноч глыбокай восенню**

Ніца сцелюцца гнуткія лозы,
Крэхча сцяты марозам дзірван,
Стогнуць белай тугою бярозы,
Вецер рве спарахнелы рызман.

Вые воўк за сцяной буралому,
Крыж пахілы ля грэблі рыпіць,
Зоркі сеюць адвечную стому,
Месяц гнутай бляшанкай блішчыць.

Ападаюць гадзінаў сняжынкі,
Ноч сцянае слязой па шчацэ,
Адплывае да хаты сцяжынка
Па яшчэ не закутай рацэ.

Ніца сцелюцца гнуткія лозы,
Спавіваюць пустэльны аблог,
І шапоча пад цупкім марозам
Душ скалелых памяты трыснёг.

24.12.94 г.

# Шлях да Беларусі

*"Ой, як далёка нам яшчэ да Беларусі"*
Ніл Гілевіч

* * *

Вее вецер над зямлёю,
Вее павявае.
Сум бяжыць у мне з крывёю,
Сум на родным краі.

Я пакінуў твае нівы,
Кінуў не араўшы,
Прытвараўся я шчаслівым
Шчасця на спазнаўшы.

Прысягаў табе на вернасць
Што дня без прычыны,
Расставаўся не на вечнасць,
А навек пакінуў.

У любові табе кляўся
Вечнай і адданай,
У сяброўствах памыляўся,
Забываў каханых.

Марыў, сніў з табой сустрэцца
Летам на світанні,
Закляпалі ў краты сэрца
Абавязкі, званні.

І няма, няма надзеі
Да цябе вярнуцца
Ціха думак лес радзее,
Ніткі сэрца рвуцца.

снежань 1984 г.

* * *

Бусел добры, бусел белы -
Сцяг радзімай стараны,
Узляці ты горда, смела,
Крыллем далі расхіні.

Ты пакліч мяне з сабою,
Я без крылаў палячу,
Роднай бацькавай зямлёю
Я надыхацца хачу.

Туманоў хачу напіцца,
Са святых крыніц вады,
Беларусі пакланіцца
Цераз вёрсты і гады.

Пахваліцца роднай мовай,
Што не страціў, што збярог,
Пахваліцца сілай новай
Для тых песень і дарог.

Што вядуць вакол Сусвету
Да зямлі маіх дзядоў...
Колькі, колькі мне да мэты
Шчэ і вёрстаў ў гадоў?

студзень 1985 г.

* * *

Мы не ўсё беззаганна рабілі
І не так бездакорна жылі,
Мы фальшывым кумірам служылі
І падману паверыць маглі.

Не пад тымі стаялі сцягамі,
І крычалі "Ура" не таму,
І не тымі хадзілі шляхамі,
І тупелі ад доўгага сну.
Мы маўчалі ў адчаі зацятым
І гарэлкай туманілі зрок,

Пакідалі мы вёскі і хаты
Дзеля пыльных, бясконцых дарог.

Нас прымалі чужыя краіны,
Мы сюды свае сілы нясьлі,
Толькі цяжкім ярмом успаміны
Нашы грэшныя душы гнялі.

Толькі ў сэрцах, як Бога, хавалі
Беларусь - нашу мару і лёс,
Зя яе, за адну мы прымалі
Зло зямлі і няміласць нябёс.

За яе, за адну ачышчэнні
Мы праходзім сягоння свае,
Мы ідзём на другое хрышчэнне,
На хрышчэнне свабодай яе.

3.07.89 г.

***

Мы йнакшыя, мы йнакшыя,
І лёс у нас другі,
І нашыя, і нашыя
Над намі ўжо сцягі.

І рыцары, і рыцары
Зноў будзяць Беларусь,
А гіцалі, а гіцалі
Бягуць, бягуць, бягуць.

Паходняю, паходняю
Мы мову пранясём,
Пагоняю, Пагоняю
Дрымоту растрасём.

Ўставайце, прачынайцеся
Ўсе чыстыя душой,
Адвагі набірайцеся,
Вас кліча Грунвальд свой.

Здзіўляйцеся, здзіўляйцеся.
Зноў рыцары лятуць,
Ўставайце, падымайцеся,
Хто любіць Беларусь.
3.07.89 г.

**Песня**

Белымі крыламі ноч расхінула,
Яснай заранкай аздобіла дзень,
Цёплаю хваляй душу агарнула,
Беды ўтапіла ў крынічнай вадзе.

Беларусь наша родная, мілая,
Ты за долю і волю мілей,
Стала марай, надзеяй адзінаю
Для тваіх на чужбіне дзяцей.

Мы пад сонцам чужым і бязлітасным
Службу нялёгкую чэсна нясём
І чакаем,каб ты нас паклікала,
Памахала буслiным крылом.

І мы вернемся ў край наш замучаны,
Зацкаваны наш край, паланёны,
Радыяцыяй чорнай атручаны,
Як вярталіся ў Польшч легіёны.

Беларусь наша родная, мілая,
Ты за долю і волю мілей,
Стала марай, надзеяй адзінаю
Для тваіх на чужбіне дзяцей.
17.08.90 г.

**Жаданне**

Мы жадаем вярнуцца ў сваю Беларусь,
Як вярталіся ў Польшч легіёны,
Каб убачыць, як моцныя рукі бяруць

Сцяг з выявaю срэбнай Пагоні.

Каб убачыць, як злыдні, што мухі, трымцяць,
Разлятаюцца з жахам шалёным,
АКМ у руках. Дай жа, Божа, ўтрымаць
І не чуць ні мальбы, ні праклёнаў.

На сцягах заблішчыць слава нашых дзядоў,
І паўстане народ з паняверкі,
І "уздасца" за кожны з бясконцых грахоў
Беларускаю шчодраю меркай.

18.09.90 г.

## Інсургенты дзевяностых

Інсургенты дзевяностых,
Джынсы і гітары,
Вы паводзін самых простых,
Ветлівыя твары.

Вы не ў пушчах, не ў балотах,
Без сякер і косаў,
Ды ад вас не меншы клопат
Бальшавіцкім босам.

Ды баяцца вас не меней,
А мо, нават, болей,
Хоць вас часта толькі жменя
На бяскрайнім полі.

Бо пакуль з вас хоць адзіны
Ў шыхце застанецца,
То датуль зямлі радзімай
Лёс не перарвецца.

13.01.91 г.

## Беларускім дэсантнікам

*5.02.91 года ў штурме Віленскага тэлецэнтра ўдзельнічалі і беларусы з Віцебскай дэсантнай дывізіі.*

Беларусь. Ноч звівае самотай.
Снегам белым зіхцяць паплавы.
Чуеш грукат? Жаўнерскія боты
Топчуць землю нам братняй Літвы.

Ты прыгледзься, няўжо не пазнала?
Там сыны твае грозна ідуць.
Ты, скажы, іх туды пасылала?
Ад цябе яны смерць там нясуць?

Адкажы, гэта ты іх вучыла,
Каб у брата, ў сястру каб страляць?
Ты для гэтага іх спарадзіла?
Ты маўчыш, бо што можна сказаць?

За дзяцей, за сваіх ты не ў стане
Нават слова прамовіць нідзе,
Мала галаваў клалі ў Афгане?
Заўтра быць у нас дома бядзе.

Заўтра ў Менску ў барэтах атрады
На народ рушаць шчыльнай сцяной,
І аддзячаць агнём з аўтаматаў
Дзеці любай матулі сваёй.

5.02.91 г.

## Беларусам

Небасхіл зноў цямнее з усходу,
Ні шляхоў, ні надзей не відаць.
Беларусы, калі ж вы народам
Хоць на дзень пажадаеце стаць?
Беларусы, калі ў вас прачнецца
Вашых прашчураў гонар і жар,

Ў вашых душах калі разальецца
Векавечнае крыўды пажар.

Вы стагоддзі глядзелі без жалю,
Як вас пляжаць паны ўсіх масцей,
Мову вашую ў бруд затапталі,
Вам чужых з вашых робяць дзяцей.

Ды ад тога няма вам кручыны,
Не ад тога душы неспакой,
Вам не трэба свабоды Айчыны,
Вам патрэбна свабоды другой.

Вы жадаеце толькі свабоды,
Кілбасу без чаргі каб купляць...
Беларусы, калі ж вы народам,
Хоць на дзень пажадаеце стаць.

24.02.91 г.

### "Абы горш не было"

Так спрадвеку вядзецца,
Як пасхло, ці згніло,
Кажам: "Нейк пяратрэцца,
Абы горш не было".

Мелі лад свой дзяржаўны,
Ды ўсё прахам пайшло,
Сталі быдлам бяспраўным:
"Абы горш не было".

Мовай роднай, вялікай
Неслі людзям святло
Сталі тлёй без'языкай:
"Абы горш не было".

Білі нас, катавалі,
Турмы - наша жытло,
А мы толькі шапталі:
"Абы горш не было".

З чорным ветрам пякучым
Смерцю край занясло,
А мы зноўку канючым:
"Абы горш не было".

Нам не трэба ні воля,
Ні зямля, ні святло
І нічога ўжо болей:
"Абы горш не было".

Дык паслухайце, людзі
Беларускай зямлі,
Будзе горш, будзе, будзе!
Мы ж да краю дайшлі.

Вера нас ратавала,
Ды яе ўжо няма,
Воля дух падымала,
Яе клічам дарма.

Беларускі народ,
Мы ж на краі быцця,
Кожны дзень, кожны год
У нас меней жыцця.

Трэ прычасце святое,
Бо ўжо дух заняло,
А мы енчым зноў тое:
"Абы горш не было".

26.03.91 г.

**Беларусь. красавік-91.**

5 красавіка 1991 года на Беларусі ўпершыню за часы перабудовы паднялі цэны на хлеб. Народ выйшаў на вуліцы.

Ціхі мой, мой цярплівы народзе,

Ну нарэшце й цябе данялі,
Ты не думаў, не дбаў аб свабодзе,
Ну то й хлеб у цябе аднялі.

Ты прывык быць малодшым і ветлым,
Паслухмяным начальству ты быў,
На шляху перад "будучым светлым"
Ты Чарнобыль сабе зарабіў.

Дык няўжо змог ты ўрэшце прачнуцца
Ад бязволля здалеў страпянуцца?
Волі сцяг твае рукі бяруць!
Ну, то дзякаваць Богу. Жыве Беларусь!
6.04.91 г.

* * *

Нам не трэба нічога на свеце,
Нам не трэба нічога ў жыцці,
Беларусь ясным сонцам нам свеціць,
Беларусь звонкай песняй гучыць.

Нам не трэба ні грошай, ні славы,
Нам не трэба спакой, дабрабыт,
Незалежнай свабоднай дзяржавы
Сцяг жадаем падняць у зеніт.

Незалежнай, свабоднай краіны
Грамадзянамі хочам мы быць,
І маліцца на клін жураўліны
І па першых пралесках тужыць.
Будзе дзень, мы вадою крынічнай
Чыста вымыем рукі свае,
Рулі ўскінем мы рухам прывычным
І паўстанем за "другі твае".
17.05.91 г.

**Радзіма-маці**

Кароткі вечар, ціхая малітва,
Званіцы даўняй векавечны звон,
І думак незакончаная бітва,
І кругаверць праклятых Богам дзён

Стаім мы моўчкі за сцяной бязвер'я,
Не ўсе прайшлі пустэчу забыцця,
І кожнаму сваёй адмераў мерай
Кравец вялікі нашага жыцця.

Стаім мы моўчкі. Вочы засцілае
Нябёс вячэрніх шэрая імгла,
За намі мілая, адзіная, святая
Радзіма наша ў роспачы лягла.

За намі ўсцяж гасцінцы і дарогі,
Гады змагання, гора і надзей,
За намі памяць, боль і страты многіх
Такіх патрэбных, родных нам людзей.

Яны ляжыць у грозных валатоўках
І ў сціпласці вясковай цішыні.
Ім грае песню светлую салоўка,
Ім шэпчуць зоркі з вечнай вышыні.

Яны ляжаць абапал пуцявіны,
Якой нам сёння выпаў лёс ісці,
Той шлях да вольнасці маёй Айчыны,
Той шлях для нас галоўнейшы ў жыцці.

Радзіма-маці - вечная краіна,
На тым шляху ізноў твае сыны,
Не зведаць ім спакою і спачыну
Пакуль з цябе не скінуць кайданы.

Ляціць над краем вечная Пагоня,
Яна нас кліча ў шчыльныя шыхты.
Калі той покліч не пачуеш сёння,
То заўтра юдаю ўжо будзеш ты.

Ляціць над краем вечная Пагоня,
І ўецца бел-чырвона-белы сцяг.
Ты чуеш, востры меч як грозна звоніць
Б'е па іржавых, клятых ланцугах?

Радзіма-маці, памяць і надзея,
Мне радасна, што ты ўстаеш з калень,
І на святло выводзіш ліхадзеяў,
Сціраеш з твару непагоды цень.

Я веру, родная, што цяжкую хваробу
Адолееш і расквітнееш зноў,
Адгоніш чорнага Чарнобыля жалобу,
І забруіцца маладая кроў.

Ляціць над краем вечная Пагоня,
Ляціць у сэрцы ў кожнага ў нас,
І востры меч, як светлы сонца промень,
І крыж, як строгі прашчураў наказ.

Ляціць над краем вечная Пагоня,
І крумкачам тут болей не лятаць,
І веру я, што рыцарам тым сёння
Ўжо наша Заўтра вольнае відаць.

16.07.91 г.

## ДА ЎСІХ БЕЛАРУСАЎ

Беларусы! Далоў нашы сваркі і спрэчкі,
Што вядом мы зацята каторы ўжо год,
Дык адкінем жа іх у глухую пустэчу,
Нас чакае даўно наш гаротны народ.

Ён усіх нас чакае і левах, і правых,
Нашы сіла і смеласць патрэбны яму,
Час настаў, пачынающца слаўныя справы,
Дык паціснем жа рукі адзін аднаму.

Так спрадвеку было, покуль мы ваявалі,

І да смерці адзін ды другога таўклі,
Нам ахвотна з-за межаў, з-за ўсіх памагалі
І на нашых магілах гарэлку пілі.

Так было, што за Польшч мы ішлі грамадою
І на Польшч мы з Масквою таксама ішлі,
І плацілі за гэта, каб толькі ж сабою,
Мы плацілі і лёсам, і воляй зямлі.

Мы чужынцам служылі, за іх ваявалі,
І мы бралі Берлін у чырвоных шыхтах,
Нас у лагеры гналі і Гітлер, і Сталін,
Нашы косці бялеюць пры многіх шляхах.

Беларусі сыны, ціж вам мала навукі?
Ці жадаеце зноўку вы ўсё паўтарыць?
Зноў на брата падымуцца братнія рукі
І зямля зыркім полымем зноўку згарыць.

Дык мо хопіць дзяліць: камуніст ці католік,
Кліча ўсіх вас Пагоня пад сцягі свае,
Кліча Маці-Айчына знямеўшы ад болю,
Кліча ўсіх вас падняцца за раны яе.

І да д'ябла няхай тая спрэчкі і сваркі,
Беларус, уставай за надзею надзей,
І хай бачаць сусветныя ўсе недаваркі,
Што краіна твая - край свабодных людзей.

5.08.91 г.

## ПАНЯВЕРКА

Хоць пра нас не пісаў Настрадамус
І пра лёс незайздросны змаўчаў,
Бачым сёння выдатна мы самі,
Што Пан-Бог нам дабра не паслаў.

Мы не маем ні веры, ні мовы,
Нашы душы да неба маўчаць,
Мы панiклі чалом ганаровым,

Сэрцы воляй у нас не гарацъ.

Занядбалі мы край свой гаротны,
Нам даўно ён, нібыта чужы,
Хай хоць курчыцца ў муках смяротных,
Не кране зачарствелай душы.

Так, нам клопату мала пра тое,
Што нам край, што нам гонар дзядоў,
Бо даўно ў нас сканала святое
Пад бясконцаю тоўшчай грахоў.

Нат імя мы сваё забывалі,
Ды харошыя дзядзькі ў Маскве
Нам у пашпарт яго запісалі,
Дзякуй ім, беларус шчэ жыве.

Шчэ гразюку халодную топча,
Калупае зямлю, як чарвяк,
А нячысцік у шале рагоча,
Бо народ наш - гатовы мярцвяк.
13.08.91 г.

**19 жніўня 1991 г.**

*У гэты дзень адбыўся путч ГКЧП.*

Беларусы, мы зноў не паспелі
Працу нашу звяршыць да цямна
Крумкачы край радзімы абселі,
І да волі дарожкі няма.
Зноў патухлі ўсе зоркі надзеі,
Зноўку цёмная ноч настае,
Зноўку песня ў адчаі нямее,
Мара крылы зламжыла свае.

Дык запалім жа паходні нашай непакоры
Шчыльнымі шыхтамі выйдзем разам, як адзін,
Нам няма дарогі ў тое чорнае заўчора,
Лепей зыркім полымем сягоння мы згарым.

Мой народзе адчайна гаротны,
Гвалт цярпець мы не зможам больш, не,
Жыць не зможам з тугою смяротнай,
Лепей легчы ў апошняй вайне.

Лепей згінуць ад кулі варожай,
Сэрцам смелым свой край асвятліць,
Лепей смерцю памерці прыгожай,
Чым без славы і гонару жыць.

Дык запалім жа паходні нашай непакоры
Шчыльнымі шыхтамі выйдзем разам, як адзін,
Нам няма дарогі ў тое чорнае заўчора,
Лепей зыркім полымем сягоння мы згарым.

19.08.91 г.

**Незалежнасць**

Светлы дзень, светлы час. Незалежнасць
Лашчыць сэрцы, і душы, і лёс.
Светлы дзень, светлы час. Непазбежнасць
Нашай волі ідзе ад нябёс.

Мы акрылены светлай надзеяй
Нашых showмараў штандары шумяць,
Нашых мрояў заранка ірдзее,
Нашых думак канём не дагнаць.
Мы паходнай святой непакоры
Разганяем бязвольнасці цвіль,
Мы ідзём на свабоды прасторы
Мы выходзім са змроку магіл.

А навокал ваўкі з крумкачамі
Шчэрaць зяпы на нашу зямлю,
Мой народ, ты з пустымі рукамі
Не адстоіш свабоду сваю.

Ты адкрытай мазольнай далонню
Мусіш толькі даваць і даваць,

Талент, хлеб і дзяцей у прадонне,
У нахабную прорву кідаць.

Дык пастаў ты далонь тую рубам,
А шчэ лепей зацісні ў кулак
Скрыгатні хоць затворам, хоць зубам
І прыпомні, што ты быў ваяк.

Ад твае ваяўнічае славы
Шмат дрыжалі і Захад, і Ўсход,
Ты -- нашчадак вялікай дзяржавы,
Мой забіты, гаротны народ.

Мы - сыны твайго вечнага болю,
Мы паўсталі ў апошні мо раз,
Мы заплацім за волю сабою,
Ты вазьмі, ты вазьмі толькі нас.

Ты вазьмі нашу смеласць і сілу,
Нашай кроўю свой сцяг акрапі
І хай нашыя будуць магілы
Для цябе, як памежжа слупы.

Каб ніколі, ніколі, ніколі
Ты не мог больш назад адысці
Са святое дарогі да волі,
З найцяжэйшай дарогі ў жыцці.

25.10.91 г.

**Уладарам беларусі**

Мы ішлі да свабоды не дзень і не год,
Мы ішлі, аж цямнела з натугі ўваччу,
І па скронях сцякаў наш скрываўлены пот,
І дайшлі. Вось яна, вось бяры - не хачу.

Мы ішлі да свабоды аддаўшы сябе
На алтар нашай вольнай, любімай зямлі,
Мы і зернем былі ў той крывавай сяўбе,
Мы дажджом, мы і сонцам, і ветрам былі.

Мы дайшлі. Ды, як здзек, раптам тыя, хто вёў,
Пхаюць зноў нас у лёхі, у путы кайдан,
Докі хітрых салодкіх і смачненькіх слоў
Зноў, як саван, на нас надзяваюць абман.

Дык паслухайце нас. Вы! Парламент! Урад!
Вам гукае гаротны, бяздольны народ,
Ён стаміўся ад вашых хаўрусаў і здрад,
Ён праклёны сабраў вам за тысячу год.

На чале Беларусі паставіў вас лёс,
Дык зірніце, загляньце вы ў жыцці свае,
Мо чый дзед растраляны сягоння ўваскрос,
Можа бацьку Чарнобыль здароўя дае?

Адкажыце, за што вы ўладарнай рукой
Край радзімы ізноў спланавалі на здзек,
Не купіць вам за нашу свабоду спакой,
Беларус зразумеў, што і ён чалавек.

Ён маліўся на вас, ён гатоў быў на бой,
Ён паверыў у чэснасць абранцаў сваіх,
А вы гоніце зноўку, як быдла, не ўбой,
А вы зноў, як варагі, у родным краі.

Дык спыніцеся! Час шчэ не сцёк, як пясок.
Што вам новы Саюз? Ён - хлусня, ён - мана!
Не рабіце апошні пагубны той крок
Бо замкнецца навекі няволі сцяна.

5.12.91 г.

## Не крыўдуй на радзіму, сынок

*(эміграцкая калыханка)*

Сонца знікла за шэрай пустыняй,
Знічкі цмяна ў начы зіхацяць,
Зноўку ў дальняй чужынскай краіне,
Мой сынок, ты ідзеш спачываць.

Мо прысніцца табе наша поле,
Наш лясок, а за ім сенажаць,
Дзе б ты мог на ласкавым прыволлі
Бегаць, гойсаць, гуляць і скакаць.

Мо прысніцца табе наша рэчка
Там дзе рыбкі снуюць чарадой,
Ці няведамай птушкі гняздзечка
Пад старой, спарахнелай вярбой.

Ты скрозь сон будзеш рвацца пад шаты
Векавечных магутных дубоў,
Зразумець не здалеўшы слоў таты,
Што цябе не пускаюць дамоў.

Што туды ты не трапіш на лета,
Ні на дзень, ні хаця б на чуток.
Мой харошы, ты толькі за гэта
Не крыўдуй на Радзіму, сынок.

Наша добрая Маці-Радзіма
Моцна любіць цябе і мяне,
Моліць Бога, каб ліха гадзіна
Нас не стрэла ў чужой старане.

Гэта кепскія дзядзькі, што ўладу
Заграбасталі ў кіпці свае,
Напрыдумаўшы ўсячанькіх звадаў
Не пускаюць дадому цябе.

Гэта ім мы, сыночак, чужыя,
Гэта ім перашкодзім мы жыць,
І яны, нібы злыдні ліхія,
Не жадаюць туды нас пусціць.

Спі, сыночак мой мілы, цудоўны,
Хай прысніцца табе лепей сон,
Што на Белай Русі стаў галоўным
Добры, ласкавы дзядзька Зянон.

Ён успомніць пра нас і пакліча,

І мы пойдзем яму памагаць,
А тых злыдняў з нялюдскім абліччам
Мы пакросім сюды адаслаць.

Спі, маленькі, і радуйся шчасцю
Ў мроях родны наведаць куток,
І нідзе, ні пры якіх напасцях
Не крыўдуй на Радзіму, сынок.
3.09.92 г.

**Прысяга**

Перад Богам Ўсявышнім і роднай зямлёю
Я табе прысягаю, радзімы мой край,
Прысягаю і сілай, і думкай сваёю,
І гарачай крывёю, і шляхам у рай.

Прысягаю палеткам і нівам жытнёвым,
І табе, памяць прадзедаў, лёгшых у дол,
І сцюдзёным завеям, і кветкам вясновым
І табе, роднай хаты амшалы вугол.

Прысягаю сягоння, і заўтра, і ўчора,
За ўсе дні, што пражыў і яшчэ пражыву,
Што нідзе і ніколі, ні ў шчасці, ні ў горы,
І ні ў сне паўсвядомым, і ні наяву.

Ні на крок не сыду я са шляху змагання,
Ні на міг не схаваю мяча і пяра,
Не пачую ні модлаў, ні слоў апраўдання
Аж да тога, пакуль не настане пара,

Што мая Беларусь перарве ўсе аковы,
І заззяе спрадвечнаю славай сваёй,
І з кайданаў праклятых паробіць падковы
Для імклівых дрыгантаў Пагоні святой.

І не здолець мяне, а ні сілай, ні здрадай,
Ні агнём, ні мячом, ні лісліваю маной,
Не купіць ні рублём, ні жытлом, ні пасадай,

Не зламаць ні ў любові, ні ў веры святой.

Я дайду і аддам і жыццё, і натхненне,
І зраблю нават тое, што нельга зрабіць,
Хай памру без надзей на грахоў адпушчэнне,
Ды ўсяроўна адну яе буду любіць,
Беларусь і па смерці я буду любіць.
15.10.92 г.

## Мой гороскоп

Я народжаны быў пад сузор'ем Пагоні
Ў краіне дзе светлыя рэкі цякуць,
Дзе пушчы спрадвечнаю мовай гамоняць
Віхуры жалобную песню гудуць.

У маім гараскопе гучыць бусла клёкат,
І сінь васілька разлілася па ім,
Цвет дзічкі старой над пахіленым плотам
І поплаў увесь ў тумане сівым.

У маім гараскопе - змаганне за волю,
Адвечная прага пазбыцца ярма,
Але ні багацця, ні мірнае долі
Чамусьці ў маім гараскопе няма.

У маім гараскопе - бацькоўскае слова
І матчына песня сардэчнай жальбы,
Магутная плынь старажытнае мовы
І поле, што вечна чакае сяўбы.

Дык што ж, ці пярэчыць мне лёсу сягоння,
Ці Бога пра іншыя зоркі прасіць?
Не, бо, калі ўжо прыйшоў над Пагоняй,
То і павінен Пагоні служыць.
8.07.93 г.

**Ліпень**

У ліпені цёплыя росы,
І ліпаю пахне зямля,
І млее высока просінь,
І шэпча адно спакваля:

"Нарэшце, нарэшце, нарэшце,
Мы вольныя воляй сваёй
Нарэшце, нарэшце, нарэшце,
Пра гонар згадалі мы свой."

А над краем вольным, смелым
Ў Слуцку, Віцебску, Мастах
Рэе бел-чырвона-белы
Старажытны слаўны сцяг.

У ліпені мягкія травы,
І птушкі ўстаюць на крыло,
І дзеці ў скляпеннях дубравы
Шукаюць заранкі святло.

"Паверце, паверце, паверце,
Не шкода мінуўшчыны нам,
Паверце, паверце, паверце,
Я волю за хлеб не аддам."

А над краем вольным, смелым
Ў Слуцку, Віцебску, Мастах
Рэе бел-чырвона-белы
Старажытны слаўны сцяг.

У ліпені светлыя далі
І час даравання грахоў
І душы людзей на скрыжалях
Далёкіх і вольных шляхоў.

"Святкуйце, святкуйце, святкуйце,
Дзень вольнасці нашай зямлі,
Святкуйце, святкуйце, святкуйце,
Бо ўсё ж мы да мэты дайшлі".

А над краем вольным, смелым
Ў Слуцку, Віцебску, Мастах
Рэе бел-чырвона-белы
Старажытны слаўны сцяг.
8.07.93 г.

**Дурны беларус**

Сваю незалежнасць за нафту
І волю дзяціную за каўбасу
Я - дурань нічога не варты
Ў маскальскую прагную краму нясу.

Я славу дзядоў у мяшэчак
І мову матулі таксама туды,
Мо дасць мне маскаль хоць з падпечак
Той самай жалезнай іржавай руды.

Я сам жа не ўмею нічога,
Скасіць там, ці поле якое ўзараць,
Калека бязрукі, бязногі
На ласку маскальскую мушу чакаць.

Хвалюе мяне, што пад'есці,
А нечы прымус мне зусім не прымус,
Нікуды не хочу я лезці,
Я ж - ціхі, рахманы, дурны беларус.
17.09.93 г.

**Здрада**

А мне няма спачыну
Ні ноччу і ні ўдзень,
Маіх дзяцей Айчыну
Скрадае ліхадзей.

Ужо сцягнуў ён мову
І нашае імя,
І ад зямель палову

Адрэзаў за дарма.
Ужо сцягнуў ён памяць
І спадчыну дзядоў,
А мы маўчым над замяць
Скалечаных гадоў.

Маўчаць навокал людзі,
Яшчэ ім не відаць,
Што заўтра ўжо тут будзе
Чужынец панаваць,

Што здрада павуціну
Штоміг вакол пляце,
Таму няма спачыну
Ні ноччу мне, ні ўдзень.

Таму крычу штомоцы:
"Прачніся, Беларусь!
Ўставайце дружна, хлопцы,
Ўжо рыцары лятуць.

Бярыце зноў сякеры,
Хто стрэльбу, а хто лом!
Агулам, цвёрда веру,
Мы здраду пабяром.

Агулам мы здалеем
Усё назад вярнуць,
Агулам адбудуем
Мы нашу Беларусь."

18.12.93 г.

## Пасля прэзідэнцкіх выбараў

Прыціхнуў дзень у заімглённай скрусе,
Прымоўк крынічак векавечны звон
І почутка па зніклай Беларусі:
"Прайграў Зянон, прайграў, прайграў, Зянон".
Прайграў Зянон, распяты на бязвер'і,
На хамстве, п'янстые і душэўнай цьме,

На рабскай настальгіі па імпер'і,
На памяці аб вітым бізуне.

Як той Хрыстос, нёс новую рэліг'ю,
Так нёс ідэі нацыі Зянон,
Але ідэі не патрэбны быдлу,
Яму патрэбна пуга і загон.

Яму карыта трэба з каўбасою,
А то і з пацярухаю якой,
І сам Хрыстос, хоць з сілаю святою
Прайграў бы ў сітуацыі такой.

І доўга Жля над беднаю краінай
Разносіць будзе гэты змрочны сказ
Пакуль не дойдзе кожнаму праз спіну,
Што не Зянон прайграў на гэты раз.

Зянон жывы і жыць надалей будзе
І дасць магчымасць зразумець, адчуць,
Прайграў не ён, а вы прайгралі, людзі,
Прайграў народ, прайграла Беларусь.
30.06.94 г.

**Рабы**

Хоць ва ўсіх краінах улада ад Бога,
У Беларусі ізноў ад Лукавага,
І зноўку нідзе і нічога святога,
Усе вінаваты, нікогачкі правага.

Зноў гнецца хрыбет у халуйскім паклоне,
І брат старэйшы натхнёна шукаецца,
Рабу лепш наетаму быць у палоне,
Чымся галодным на волі маяцца.

Рабу лепш на мове вішчаць гаспадарскай,
Чымся на роднай сваёй заспяваці,
І жыць на канюшні, ці псарні царскай,
Чымся ва ўласнай, ды бедненькай хаце.

І лепш, як да працы паставіць падпанак,
Чымся думаць уласнай сваёй галавою,
Рабу лепш прывычны бізун з абаранкам,
Чымся клопат над роднай, збалелай зямлёю.
5.09.94 г.

* * *

Хоць склад не надта "выкшталцоны"
І не зусім высокі стыль,
Я на нянавісць і праклёны
Яшчэ збярог з дастаткам сіл.

Яшчэ мой верш не захлынуўся
Ў струменях бруду і маны,
Яшчэ гучаць над Беларуссю
Цяжкія словы, як званы.

Яшчэ магу я вострым словам
Будзіць знявераны народ,
Трасці бяздумныя галовы,
Прастаць іржавай думкі дрот.

Яшчэ магу я небяспеку,
Як на далоні паказаць,
Яшчэ магу я чалавеку
Святую праўду расказаць.

Таму гукаю я, што сілы:
"Пастой, адумайся народ,
Адной нагой ты ўжо ў магіле
І жыць табе мо колькі год.

Ты сам пахмельнай галавою
Паставіў д'ябла над сабой,
За дур заплаціш ты крывёю
І доляй горкаю сваёй.

За дур заплаціш ты краінай
Свабодай, мовай і дзяцьмі,

Тады адчайнаю хвілінай
Зальешся горкімі слязьмі.

Тады звядзеш ты бровы грозна,
Рукою схопіш за сахор,
Ды будзе позна, будзе позна,
Здзяйсніцца лёсу прыгавор".

6.02.95 г.

* * *

Раз дурныя беларусы
Волю атрымалі,
Што рабіць з ёй, беларусы
Аніяк не знялі.

Палажылі ды ў камору,
Ночвамі накрылі,
З'елі мышы тую волю,
Доляй закусілі.

Рэшту вымелі з каморы
Ды ў свіней карыта,
Закапалі ды ў разору,
Каб расла, як жыта.

Ой, не хоча тая воля
Ды сама ўзрастаці,
Трэба, трэба тую волю
Кроўю паліваці.

Адкапалі тую волю,
Ды ўзялі ў збачонак:
"Ты купі ў нас волю-долю,
Добранькі паночак".

Аж тры грошы атрымалі
Ды за волю тую,
У карчомцы прагулялі
Беларусь святую.

12.05.95 г.

* * *

Не трэба плакаць над Пагоняй,
Яна аб тым не просіць вас,
Яе святым, гарачым коням
Сюды ляцець яшчэ не час.

Яшчэ павінен хам з дубінай
Над намі добра ўспанаваць,
Яшчэ павінны мы праз спіну
Пагоні значнасць успрыняць.

Яшчэ павінны потам-кроўю
Разоры шэрыя паліць,
Яшчэ павінны мы любоўю
Чужынцаў сквапных наталіць.

Яшчэ пасланы дзяцей павінны
На бой за нечы інтарэс,
Каб беларус у кроў нявінных,
Як у дзярмо чужое ўлез.

Яшчэ мы мусім быць рабамі,
Пакуль не ўскорміць чорны хлеб
Таго, хто ўздыме зноў над намі
Наш векавечны, слаўны герб.

Тады ізноў святыя коні
Прымчаць праз полымя і час,
І будзе ў сёдлах той Пагоні
Па месцу вольнаму для нас.

3.07.95 г.

## Літаратурныя матывы

Мала вам песні гаротнага Янкі?
Мала Якуба вам мудрага слоў?
Вы ў наша цела, як хіжыя п'яўкі,
Зноўку ўпіліся і смокчаце кроў.

Мала калосся ўжо вам пад сярпамі?
Мала сякеры пры дрэве маім?
Сэрца маё вы рвяце кіпцюрамі,
Топчаце ботам нямытым сваім.

Мала легендаў пра меч князя Вячкі?
Мала пра Воршу вам песень чуваць?
Мала, што мы ўжо паўсталі ад спячкі?
Мала, што з коленак здолелі ўстаць?

Мала цяжару ў вышкаленых кроках?
Мала нянавісці ўзрошчай ў вяках?
Да шаблі Кастуся ў запыленых похвах
Цягнецца моўчкі народа рука.

18.10.95 г.

***

Каб любіць Беларусь нашу мілую
Трэба ў розных краях пабываць.

Каб любіць Беларусь нашу мілую,
Я гатоў паўтарыць зноў і зноў,
Трэба жыць побач з продкаў магіламі,
Трэба спаць між амшалых вуглоў.

Трэба ў поле выходзіць на досвітку,
Трэба піць мнагатраўя няктар,
Трэба чуць між вясновага росквіту
Плач жалобны мільёнаў ахвяр.

Трэба ведаць той цвік пад застрэшынай,
Дзе павесіў сявеньку твой дзед,
Як адбітак купчастай арэшыны
Патануў у сцюдзёнай вадзе.

Трэба згадваць страху саламяную,
Дзе бацькоўскі хаваўся абрэз,
І кашулю даўней вышываную,
І маёва заплецены бэз.

Трэба ведаць дарожкі і сцежачкі,
Дзірку ў плоце і ў рэчцы брадок,
Стог саломы, дзе змог бы адлежацца,
Каб ад стомы смяртэльнай знямог.

Трэба ведаць зямельку - карміліцу,
І тады ў найвялікшай бядзе
За табою сцяною падымуцца
Бацька з братам і з прадзедам дзед.

І паўстануць тады з табой поручкі
І твой лес, і твой дождж, і твой снег,
І ніякай варожае сволачы
Не адолець ніколі цябе.

Каб любіць Беларусь нашу мілую,
Я гатоў паўтарыць зноў і зноў,
Побач з продкаў святымі магіламі
Сам павінен быць легчы гатоў.

30.10.95 г.

**Дзядам**

У дзень святых дзядоў
З-за далечы гадоў
Прыдзіце продкі нашы,
Прыдзіце з-пад Стажар
І плюньце гідка ў твар
Нам, нізка гэдак паўшым.

Прыдзі, князь Усяслаў,
Ты дню не дазваляў,
Пабыць у нас няволі.
Прыдзі, князь Рагвалод,
Бо твой магутны род
Не ўстане ўжо ніколі.

І ты прыдзі Вітаўт,
І твой хай прыдзе брат,
Вы шыяў не хілілі

Вы самі кожны год
На захад і на ўсход
Са славаю хадзілі.
Прыдзі, князь Гедзімін,
Прыдзі ж ты не адзін,
Тут маеш шмат работы.
Прыдзіце ваяры,
Што леглі без пары
Па пушчах і балотах.

Прыдзі і ты, Кастусь,
Паглянь на Беларусь,
Змахні слязу рукою.
За гэты вось народ
Ты стаў на эшафот
І шлюб узяў з пятлёю.

За гэты вось народ,
За гэты бляклы зброд
Бязродных папугаяў...
Прыдзіце сёння ўсе,
Хто ў сэрцы боль нясе,
За лёс прадзедаў краю.

Без вас нам не здалець,
Без вас не ацалець
У бітве з недавяркам,
Што хоча нас зламаць,
Што хоча нас трымаць
З навек сагнутым каркам.

Прыдзіце, ваяры,
І гнеў хай узгарыць
У тысячах агнісак.
Мы прымем той пажар,
Як шчодры божы дар,
І кінем душы ў прысак.

І зноў меч у рукахІ прэч халопскі страх,
І пад абцас бязвер'е.
Прыдзіце ўсе, дзяды,

І мы з хваста ў бяды
Парвём арліных пер'яў.

1.11.95 г.

***

Над маёй Краінай
Чорны дзень стае,
Плачуць у магілах
Прашчуры мае,

Плачуць над зямлёю
Зданаю ў палон,
Плачуць над хадаю
Нашых чорных дзён,

Плачуць над народам,
Што забыў сябе.
Што за кожным годам
Чэзнуў і слабеў,

Што ўзгадоўваў погань
Як бы з нечых чар,
Навучаў і песціў
Хіжых янычар.

Плачуць у магілах
Прашчуры мае,
Ды на слёзы сілаў
Больш ім не стае.

Хутка, хутка ўстануць
Здані ваяроў,
Забруіцца помстай
Іх святая кроў.

Праляціць Пагоня
Па маім краі,
Ў страсе заскуголяць
Быдла, халуі.

Помста заіскрыцца,
Як лясны пажар,
Крумкачня зляціцца
Дзеўбці янычар.

31.07.96 г.

**На развал у БНФ**

Вішчыць ад радасці з экрана
Сівой кабылы меншы брат,
Аналізуе апантана
Апошні ў БНФ расклад:

Ура! Нарэшце падзялілі
І падарвалі Фронт знутры,
Такую глыбу развалілі,
Удача, што ні гавары.

Пазняк растраціў па замежжы
Мінулы свой аўтарытэт,
І ад яго ўжо не залежыць
Нічога, гэта не сакрэт.

А маладыя... Што ж ім трэба
Яшчэ дайсці да тых вышынь,
Ім да Зянона, як да неба,
І год патрэбен не адзін.

Таму спісаць ў архіў патрэбна
"Нацыянальных змагароў",
Што так бясслаўна і ганебна
Распаліся, як штабель дроў...

Ну што ж, хай цешыцца з экрана
Сівой кабылы меншы брат,
Але смяяцца ці не рана,
Ці справядлівы ў вас расклад?

Фронт не распаўся і ніколі
Не разваліць яго нічым,

Бо Фронт -- нам сцежачка да волі,
Бо Фронт -- нам znічачка ўначы.

Мы зменім сродкі, зменім імя,
Мы зменім тых, хто нас вядзе,
Але запэўню вас ў адзіным:
Мы не падзенемся нідзе.

Мы, Фронт -- часціначка народа,
Мы, Фронт -- крывінaчка яго,
Мы, Фронт -- кавалачак свабоды
Для краю роднага свайго.

Мы не пакінем сваіх мараў,
І не бярыце нас на понт,
Заўсёды грознай божай карай
Вісець над вамі будзе Фронт.

Вы спаць і сніць павінны, злыдні,
Што вам капец рыхтуе Фронт,
І хай не сёння, не на тыдні,
Хай цераз месяц, цераз год...

А покуль радуйцеся сказам,
Што разваліліі нас з-за плеч.
Мы ёсць, былі і будзем разам
І будзем вам, як востры меч.
5.09. 99 г.

## Мы не можам прайграць

Супраць нас цэлы свет,
Незлічоная раць,
З намі нацыі цвет,
Мы не можам прайграць.

Супраць нас зло вякоў,
Хцівасць, здрада і мразь,
З намі слава дзядоў
Мы не можам прайграць.

Супраць нас злы маскаль,
Марыць зноў нас забраць,
З намі мужнасць і сталь,
Мы не можам прайграць.

Нам не страшная смерць,
Стануць дзець за нас,
Страшна толькі не ўспець,
Прапусціць гэты час.

Мы паўсталі ізноў
За свабоду і лёс,
Супраць "брацкіх" акоў,
Супраць гвалту і слёз.

Ты паглянь навокал,
Воі грозна маўчаць,
Тут наш свет, тут наш дол,
Мы не можам прайграць.

20.04.95 г.

© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2011 год
© PDF: Камунікат.org, 2011 год

## ЗМЕСТ

Пагоня за мову
Усяславічы
Нясвіж
Наш Грунвальд. Вянок санетаў
Беларуская вясёлка
Шлях да Беларусі

**Станіслаў Суднік**

"Мой Грунвальд"

На беларускай мове

Наклад 250 асобнікаў

На правах рукапісу аўтара

У якасці ілюстрацый скарыстаны кампутарныя коладжы паводле малюнкаў мастакоў М. Рыжага, В. Сташчанюка і інш. Кампутарны дызайн Максіма Судніка

Кніга надрукавана пры дапамозе Гарадзенскага грамадскага аб'яднання "Ратуша" "The Ratusha Regional Public Amalgamation"

© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2011 год
© PDF: Камунікат.org, 2011 год